Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

# ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ПВК і СНК БССР

САКАВІК 3 СУБОТА 1934 г. № 48 (4881) Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся

## УСЕБЕЛАРУСКАМУ З'ЕЗДУ НАСТАЎНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

Дарагія таварышы, прыехаць не змагла. Шлю вам самае гарачае прывітанне, жадаю поспеху ў далейшай рабоце. Расціце з рабят свядомых будаўнікоў соцыялізма. Зробім Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік самай культурнай краінай у свеце. Рада бачыць беларускіх настаўнікаў у першых радах барацьбітоў за соцыялізм.

**Н. К. КРУПСКАЯ**

# АБ НАРОДНА-ГАСПАДАРЧЫМ ПЛАНЕ НА 1934 год

## *Даклад старшыні СНК тав. М. М. ГАЛАДЗЕДА на сесіі ЦВК БССР 22 лютага 1934 г.*

— Таварышы, V сесія ЦВК БССР пачынае сваю работу ў знамянальны перыяд. Дванаццаць дзён таму назад скончыў сваю работу XVII з'езд комуністычнай партыі большэвікоў, які адкрыў новую старонку барацьбы пролетарыята і калгаснага сялянства за соцыялізм. XVII з'езд адлюстроўвае новую эпоху ў развіцці пролетарскай рэволюцыі. Наша партыя на сваім XVII з'ездзе падагуліла вынікі вялікіх работ і барацьбы і вызначыла далейшую ліганцкую праграму на другую пяцігодку — праграму пабудовы бясклассавага соцыялістычнага грамадства. З'езд не толькі прыняў праграму і план другой пяцігодкі, але і ўказаў шляхі яе выканання, прыняўшы пастанову па арганізацыйнаму пытанню.

У дакладзе нашага вялікага **Сталіна** буйнымі штрыхамі паказана вялікая праграма і план нашай работы, таксама ўказан і ключ да вырашэння пастаўленых задач. Гэтыя абставіны пакладваюць і на работу нашай сесіі адпаведныя абавязкі. Работа сесіі павінна ад пачатку да канца праходзіць пад знакам вызначэння практычных мерапрыемстваў па выкананню дырэктыў XVII з'езда ВКП(б) і гістарычных указанняў тав. Сталіна.

Наша сесія знамянальна яшчэ і тым, што яна ўпершыню сабралася пасля святкавання 15-гадовага юбілея БССР. Нядаўна скончылася 15 год з часу ўтварэння Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, і XV з'езд КП(б)Б адзначыў гэта свята як вялікі гістарычны факт.

На XVII з'ездзе ВКП(б) наша краіна падвяла вынікі барацьбы пролетарыята за 10 год без Леніна. Перамогі ў гэтай барацьбе казачна-ліганцкія. СССР ператварыўся з адсталай, у мінулым аграрнай краіны ў краіну індустрыяльную, у краіну самага буйнага ў свеце земляробства. На гэтай аснове росту ўсяго Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік вырасла і ўзмацніліся нацыянальныя рэспублікі. І БССР да свайго 15-годдзя падагуліла вынікі надзвычай вялікіх перамог.

Прайшло ўсяго 15 год, а Беларусь Совецкая стала непазнаванай. Карэнным чынам змянілася эканамічная і сацыяльная база як у горадзе, так і на вёсцы. Узнялася беларуская культура і добрабыт працоўных мас. На руінах мінулага вырасці новыя фабрыкі і заводы; па абшарах БССР, на курганах і пралесках вырасці калгасы і саўгасы. На фоне фабрык і заводаў, калгасаў і саўгасаў высяцца школы, тэхнікумы, інстытуты, універсітэты. Усе раны, нанесеныя войнамі і акупацыямі, Беларусь да свайго 15-годдзя цалкам загаіла.

15 год маладая Беларусь Совецкая расла і ўзмацнялася пад штодзённым і ўважлівым кіраўніцтвам нашай слаўнай большэвіцкай партыі, пад мудрым і геніяльным кіраўніцтвам вялікага Сталіна. Таму Беларусь Совецкая за 15 год вырасла ў адну з самых моцных, эканамічна і культурна развітых перадавых совецкіх рэспублік, якая стаіць як перадавы авангард вялікага Совецкага Саюза на мяжы з капіталістычным Захадам. З саматужнай, дробна-сялянскай Беларусь ператварылася ў індустрыяльна-калгасную. У параўнанні з даваенным часам Беларусь непазнаваная.

Вось некалькі прыкладаў і фактаў гэтага. Даходы ад прамысловасці ў 1913 г. у Беларусі складалі ўсяго 17 проц. усіх даходаў, прычым фабрычна-заводская прамысловасць складала ўсяго 28,4 проц., а рамесніцка-саматужная — 71,6 проц. Колькасць рабочых у адносінах да ўсяго насельніцтва раўнялася 0,57 проц. Сельская гаспадарка Беларусі была дробна-сялянскай з адсталымі формамі гаспадарання, з аднаго боку, і кулацка-памешчыцкай,—з другога. У вёсцы было вялікае аграрнае перанасяленне таму, што працоўнае сялянства карысталася 34,4 проц. зямлі, а 65,6 проц. зямлі знаходзілася ў руках памешчыкаў, у руках кулакоў і духавенства. Бядняцкае сялянства знаходзілася ў кабале ў кулака і памешчыка, а серадняцкае сялянства ў асноўнай сваёй масе жыло і заўсёды знаходзілася пад пагрозай збяднення і разарэння.

Зараз, да свайго 15-годдзя, БССР мае буйную калгасна-соўгасную сельскую гаспадарку. Ліквідавана кулацкая кабала і кулацтва як клас. Калгасны лад у беларускай вёсцы прывёў да ліквідацыі расслаення сялянства на заможных і незаможных, на кулакоў і беднякоў. Калгаснае сялянства Беларусі ў цэлым, як і ўсяго Совецкага Саюза, стала ўжо на шлях заможнага жыцця. Век сахі і беларускай вёсцы кануў у далёкае мінулае, на змену яму прышоў і ўзмацніўся век трактароў і машын. Беларуская сельская гаспадарка атрымала да свайго 15-годдзя 3.223 трактары і за апошнія 5 год на 28 млн. руб. сельска-гаспадарчых машын і рознага сельска-гаспадарчага інвентара. Гэтыя трактары дашчэнту выкарчоўваюць адвечную галечу і цемру беларускай вёскі, яны бязлітасна выкарчоўваюць астаткі кулацтва і глыбока, раз назаўсёды заворваюць кулацкую кабалу і эксплаатацыю як пустазелле, ачышчаючы шырокія калгасныя палі ад усякага смецця для ўздыму высокага калгаснага ўраджаю.

Рабочыя БССР, калгаснікі і ўсе працоўныя масы сваю пятнаццатую гадавіну адзначаюць пабудовай фундамента соцыялізма, адзначаюць поўным трыумфам нацыянальнай палітыкі Леніна-Сталіна. Гэта самае галоўнае дасягненне, якое можна канстатаваць да 15-годдзя БССР.

## I. ВЫНІКІ ПЕРШАЙ ПЯЦІГОДКІ ПА СССР І БССР

Таварышы, разгляд і зацвярджэнне народна-гаспадарчага плана на 1934 г. адбываюцца на фоне пасяховага завяршэння першай пяцігодкі за чатыры гады і выканання плана першага года другой пяцігодкі—1933 г.

Вынікі першай пяцігодкі ліганцкі вялікія. Наша большэвіцкая партыя і совецкі ўрад вырашылі ў першай пяцігодцы карэнныя задачы соцыялістычнай рэволюцыі, па-першае, індустрыялізацыю краіны і, па-другое, на падставе індустрыялізацыі пераробку сельскай гаспадаркі на калгасны лад, і тым самым далучылі мільённае працоўнае сялянства да фактычнага ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве. Гэтым фактам вырашана самая цяжкая задача соцыялістычнага будаўніцтва. Па-трэцяе, разгромлена кулацтва як клас —гэты апошні капіталістычны клас; чацвертае, пабудован фундамент соцыялістычнай эканомікі, і, пяцое, пятае, узмоцнена абароназдольнасць нашай краіны на новай тэхнічнай аснове.

Капкрэтныя факты аб выкананні першай пяцігодкі сведчаць аб наступным.

### У ГАЛІНЕ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ СССР

За гады першай пяцігодкі па Саюзу ССР затрачана на капітальнае будаўніцтва народнай гаспадаркі 25 млрд. руб. супроць 19,1 млрд. руб., як гэта вызначалася планам, прычым у цяжкую прамысловасць укладзена 21,3 млрд. руб. Пабудавана, такім чынам, шмат буйных ліганцкіх індустрый, рэканструявана на падставе навейшай тэхнікі многа старых прадпрыемстваў. Гэта прывяло да таго, што прадукцыя цэнзавай прамысловасці па Саюзу ССР вырасла з 15,7 млрд. руб. у 1928 г. да 35,3 млрд. у 1932 г., або рост на 124,9 проц. Гэты аб'ём прамысловай прадукцыі перавысіў даваенны ўзровень больш чым у 3 разы і больш чым у 2 разы перавысіў прадукцыю 1928 г.

Удзельная вага прамысловай прадукцыі да ўсёй прадукцыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі павысілася з 54,5 проц. у 1929 г. да 70,7 проц. у 1932 г.

Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што СССР у першую пяцігодку ператварыўся ў індустрыяльную краіну, тым больш, што ва ўсёй гэтай прадукцыі прамысловасці галоўнае месца займаюць машыны, сродкі вытворчасці. Напрыклад, удзельная вага сродкаў вытворчасці павысілася з 44,0 проц. у 1928 г. на 52,0 проц. у 1932 г. Агульнае машынабудаўніцтва ўзрасло з 2.135 млн. руб. да 9.800 млн. руб. у 1932 г., прычым асабліва ўзнялося сельска-гаспадарчае машынабудаўніцтва, трактарная і аўтамабільная прамысловасць.

Усё гэта прывяло да таго, што ў нас ёсць поўная магчымасць праектаваць і вырабляць любую машыну, якая выпускаецца ў свеце.

У выніку ўсяго гэтага СССР ператварыўся ў адну з самых індустрыяльных краін свету, у краіну самай магутнай індустрыі і перадавой тэхнікі. Наша залежнасць ад эканамічна - развітых капіталістычных краін усё больш сходзіць на нішто.

Другая пяцігодка карэнным чынам адрозніваецца ад першай тым, што мы ў сілах вырабіць патрэбныя нам машыны, варштаты і інш. абсталяванне на сваіх уласных совецкіх заводах.

Другая пяцігодка будзе праходзіць пад знакам усё большага скарачэння завозу машын і абсталявання з капіталістычных краін.

**Па БССР** мы ўклалі ў прамысловасць за чатыры з чвэрткай гады 338,0 млн. руб. замест 311,2 млн. руб., вызначаных планам, прычым у прамысловасць групы «А» (гэта зн. у буйную прамысловасць БССР) укладзена 167,8 млн. руб. замест 139,5 млн. руб., вызначаных планам.

Шмат мы пабудавалі, як вам вядома, фабрык і заводаў (пералічваць я іх не буду—яны ва ўсіх на вачах), а старыя прадпрыемствы мы рэканструявалі так, што іх зусім не пазнаць. Замест саматужных майстэрань у нас выраслі фабрыкі і заводы з перадавой навейшай тэхнікай. Прыкладам гэтаму могуць служыць у Менску заводы імя Варашылава, «Большэвік» і т. д.

Усё гэта прывяло да таго, што валавая прадукцыя прамысловасці БССР узрасла з 241,2 млн. у 1928 г. да 979,5 млн. руб. у 1932 г., што дало рост на 306,1 проц., а сярэднегадавы прырост прадукцыі прамысловасці (саюзнай і рэспубліканскай) складае 48,2 проц. Я гэтыя лічбы сярэдняга прыросту прадукцыі ў год агалашаю для таго, каб зразумець, што БССР за першую пяцігодку, як і за ўвесь час свайго існавання, мела значна большыя тэмпы росту, чым у сярэднім па Совецкаму Саюзу.

Усе гэтыя дасягненні як па Саюзу ў цэлым, так і па БССР мы маем толькі дзякуючы таму, што наша ленінская партыя і ўрад Саюза ССР няўхільна праводзяць нацыянальную палітыку, палітыку Леніна-Сталіна, накіраваную на ўздым эканомікі і культуры адсталых у мінулым народнасцей, штодзённа і сістэматычна дапамагаюць матэрыяльнымі і грашовымі сродкамі, дапамагаюць і штодзённым кіраўніцтвам. Асаблівую ўвагу ў справе развіцця эканомікі і культуры нацыянальных рэспублік аддаваў і аддае тав. Сталін, і ў практыцы і ў палітыцы мы заўсёды адчуваем яго непасрэдны удзел, удзел вялікага правадыра.

### У ГАЛІНЕ РЭКАНСТРУКЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

Совецкі саюз і ў гэтай галіне мае таксама неазмерна вялікія дасягненні за гады першай пяцігодкі.

Галоўнае і асноўнае дасягненне заключаецца ў тым, што сельская гаспадарка Саюза з дробна-сялянскай ператварылася ў буйна-калгасную гаспадарку.

За гады першай пяцігодкі створана па Саюзу больш 200 тыс. калгасаў, 5 тысяч соўгасаў і 2 з паловай тыс. МТС. Удзельная вага соўгасаў і калгасаў у пасеве ўсіх культур па Саюзу ўзрасла з 2,8 проц. у 1928 г. да 79,7 проц. у 1932 г., а ўдзельная вага соўгасаў і калгасаў у валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі ўзнялася з 3,0 проц. у 1928 г. да 74,7 проц. у 1932 г.

За чатыры гады пяцігодкі сельская гаспадарка Саюза атрымала сельгасмашын на 1.610 млн. руб., а трактарны парк узрос за пяцігодку з 26,7 тыс. трактароў магутнасцю ў 278 тыс. конскіх сіл да 148 тыс. трактароў магутнасцю ў 2.225 тыс. конскіх сіл.

**Па БССР** сельская гаспадарка за гады першай пяцігодкі таксама атрымала буйнейшыя перамогі. Галоўнейшыя і рашаючыя з іх—гэта пераводпаловы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак на шлях калгасаў і ліквідаванне кулацтва як класа.

Калгасны лад і ў беларускай вёсцы ўзмацніўся раз і назаўсёды. За гады першай пяцігодкі ў БССР арганізавана каля 9000 калгасаў і 219 новых соўгасаў. Соўгасы і калгасы БССР у 1932 г. ахапілі звыш 50 проц. усіх пасеўных плошчаў. Капіталаўкладанні ў аграмаджаны сектар сельскай гаспадаркі БССР за гады першай пяцігодкі складаюць 237 млн. руб. і перавысілі план на 8,8 проц. У 1928 г. на адну бядняцка-серадняцкую сялянскую гаспадарку прыходзілася с.-г. машын у сярэднім на 15 руб., а к канцу першай пяцігодкі, гэта значыць у 1932 г., на адну гаспадарку прыходзіцца машын на 43 руб.

Трактарны парк павялічыўся з 102 трактароў магутнасцю ў 1,2 тыс. конскіх сіл, якія мы мелі ў пачатку пяцігодкі, да 2822 трактароў магутнасцю ў 33,4 тыс. конскіх сіл у канцы 1932 г.

З гэтых кароткіх лічбаў і фактаў відаць, што на падставе агульнага росту індустрыі Совецкага Саюза пераўзброёваецца і пасяхова рэарганізуецца сельская гаспадарка Беларусі, як і ўсяго Совецкага Саюза. Мы пераселі ўжо з сахі на трактар, пасапраўднаму і раз назаўсёды раз віталіся з сахой. Няма звароту сахе, няма і яшчэ раз няма звароту кулацкай кабале ў беларускую вёску (воплескі).

### У ГАЛІНЕ МАТЭРЫЯЛЬНАГА І КУЛЬТУРНАГА ДОБРАБЫТА ПРАЦОЎНЫХ ГОРАДА І ВЁСКІ

Першая пяцігодка і тут таксама прынесла вялікія дасягненні. Па ўсяму Саюзу ССР ліквідавана беспрацоўе, лік рабочых і служачых узрос з 11,6 млн. чал. у 1928 г. да 22,9 млн. чал. у канцы 1932 г.

Сярэдняя гадавая зарплата ўзрасла па Саюзу з 703,4 млн. руб. у 1928 годзе да 1.432,4 млн. руб. у 1932 г. Лік граматных вырас з 33 проц. у 1913 г. да 90 проц. у 1932 г. У сувязі з гэтым вышэй узнялася культура працоўных мас Совецкага Саюза, вырасла вялікая сетка школ, ВНУ, ВТНУ, інстытутаў і мы з поўнай упэўненасцю можам заявіць, што СССР ператварыўся ў краіну самай перадавой культуры ў свеце.

**У БССР у галіне матэрыяльнага і культурнага добрабыта мас** мы таксама маем значныя поспехі. У нас таксама няма беспрацоўя, няма ў нас такога становішча, каб рабочы галадаў ад беспрацоўя. Наадварот, у нас наглядаецца ва многіх галінах народнай гаспадаркі недахват рабочых рук, і перад намі стаіць рэальная новая праблема, як лепш арганізаваць працу рабочых, працоўных мас, каб не было недахвату ў рабочых руках на фабрыках, заводах, у калгасах і соўгасах. Лік рабочых і служачых узрос у БССР з 303,5 тыс. у 1928 г. да 542,5 тыс. чал. у 1932 г. Сярэдняя зарплата працоўнага ў год вырасла з 536 руб., якія рабочы ў год зарабляў у 1928 г., да 1.281 руб. у 1932 г.

У вёсцы поўнасцю ліквідавана кулацкая кабала і эксплаатацыя. Беларускі селянін-калгаснік больш ат рымлівае на працадзень, ліквідавана ў асноўным няграматнасць. На канец 1932 г. граматнасць насельніцтва БССР ва ўзросце ад 10 да 50 год даходзіла да 95,3 проц.

Як вынік гэтага ўздыму матэрыяльна-культурнага становішча працоўных мас Беларусі, мы маем рэзкае паданне смяротнасці сярод насельніцтва. Процант смяротнасці на 1000 жыхароў у 1913 годзе складаў 19-20 чалавек, у 1928 г. раўняўся 14—15 чал., а ў 1932 г. гэта смярот насць скарацілася да 11—12 чал. на тысячу. Амаль у два разы скарацілася смяротнасць. Гэта найбольш яркі паказальнік таго, як узнялося матэрыяльнае і культурнае становішча рабочых мас, бо матэрыяльная забяспечанасць і культура працоўных захоўвае жыццё чалавека.

Шырока разгорнута першай пяцігодкай сетка школ усіх нацыянальнасцей, якія насяляюць БССР, сетка тэхнікумаў, ВНУ, ВТНУ, навукова-даследчых устаноў; таксама значна пашырылася выдавецкая справа — кнігі, газеты і т. д.; арганізаваны новыя тэатры. Я не буду прыводзіць лічбаў для скарачэння часу, але вам вядома, што і БССР у складзе ўсяго Совецкага Саюза з'яўляецца адной з самых перадавых рэспублік высокай пролетарскай культуры. Гэтыя вынікі першай пяцігодкі з'яўляюцца для ўсіх відавочнымі, яны далі нам падставу і з'явіліся моцнай прадпасылкай для другой пяцігодкі. Гэтыя вынікі і перамогі не прышлі самі сабой, ячы, гэтыя перамогі першай пяцігодкі і ўсяго папярэдняга перыяда нашага будаўніцтва адваяваны рабочым класам у цесным саюзе з прапоўным сялянствам пад сталінскім кіраўніцтвам нашай большэвіцкай партыі, яны адваяваны ў бязлітаснай барацьбе з кулацтвам, з авантурыстычнымі элементамі, шкоднікамі, з нацыяналістычна-буржуазнымі элементамі. Усе гэтыя перамогі з'явіліся ў выніку поўнага трыумфа генеральнай лініі нашай партыі, у выніку разгрому антыленінскіх тэорый і носьбітаў гэтых тэорый, якія прапаведваліся «левай» і правай апазіцыямі ўнутры большэвіцкай партыі, у выніку разгрому тэорый, якія маглі прывесці нашу краіну да рэстаўрацыі капіталізма. Як трацкізм, так і правы апартунізм адлюстроўвалі націск варожых класаў на партыю. Разгромлена кулацтва, разбіты яго ідэолагі — усякія правыя і «левыя» ўхілісты ў партыі.

Дабіліся мы гэтага толькі таму, што пасля смерці вялікага Леніна на чале партыі стаў яго верны вучань—вялікі Сталін, які непахісна пашоў на ленінскаму шляху і прывёў нашу краіну ўшчыльную да бясклассавага грамадства.

Выкананне першай пяцігодкі праходзіла ў складаных міжнародных абставінах. І ў гэтых складаных між народных абставінах мы павінны былі будаваць нашу індустрыю, рэарганізоўваць сельскую гаспадарку на калгасны лад і адначасова ўзмацняць абароназдольнасць нашай краіны, узмацняць нашу слаўную рабоча-сялянскую Чырвоную армію.

Без гэтага ўсяго не было чаго і думаць аб пасяховым выкананні першай пяцігодкі. Без гэтага капіталісты напэўна сарвалі-б нам выкананне першай пяцігодкі.

Толькі таму, што мы былі моцны, што мы, індустрыялізуючы нашу краіну, узмацнялі і нашу Чырвоную армію на новай тэхнічнай базе, мы змаглі гарантаваць выкананне першай пяцігодкі ў чатыры гады.

За гады першай пяцігодкі мы маем надзвычай вялікія дасягненні і ў міжнародным палітыцы. За гэты час, асабліва за апошнія гады, СССР заключыў рад пактаў з рознымі капіталістычнымі краінамі, узмацняючы мір. Пералічваць гэтыя пакты я не буду — яны ўсім вядомы. Але гэтым самым СССР узмацніўся як фактар міру ва ўсім свеце. Зараз няма ніводнай краіны ў свеце, у якой-бы працоўныя масы не ведалі, што самы надзейны, самы верны барацьбіт за мір, барацьбіт супроць вайны — гэта СССР.

Таму палітыка совецкага ўрада і набывае поспехі на міжнародным арэне, што яна цалкам і аднадушна падтрымліваецца ўсімі працоўнымі масамі Совецкага Саюза, а таксама яна знаходзіць актыўнае падтрыманне і сярод працоўных мас і інтэлігенцыі ўсіх капіталістычных краін, краін усяго свету.

## II. АСНОЎНЫЯ ЗАДАЧЫ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ І ВЫНІКІ 1933 г.

Якія ў нас вынікі па выкананню плана 1933 г.?

Дазвольце прывесці некаторыя прыклады, каб на аснове вынікаў 1933 г. запраектаваць, прыняць, а потым выконваць народна-гаспадарчы план 1934 г.

У галіне прамысловасці па ўсяму Саюзу мы мелі далейшы рост. Пры росту прадукцыі буйнай прамысловасці вымяраецца ў 9 проц., або прадукцыя павелічылася на 3,5 млрд. руб., у тым ліку прырост на цяжкай прамысловасці на 11,5 проц.

Ёсць значныя дасягненні па прамысловасці ў справе павышэння прадукцыйнасці працы і па зніжэнню сабекошту. Гэта асабліва траба адзначыць таму, што ў папярэднія гады па раду галін прамысловасці было павышэнне сабекошту прамысловай прадукцыі і слабае павышэнне прадукцыйнасці працы.

Зніжэнне сабекошту і павышэнне прадукцыйнасці працы сведчаць перш за ўсё аб поспехах у справе асваення новай тэхнікі, новых вытворчасцяй, новых фабрык і заводаў, якія пушчаны ў эксплаатацыю ў першай пяцігодцы.

За 1933 г. уведзена ў строй па Саюзу многа новых фабрык і заводаў, многа задута новых даменных і мартэнаўскіх печаў, павелічыўся выраб новых машын, асабліва трактароў і аўтамабіляў.

Як бачыце, 1933 г., першы год другой пяцігодкі, для прамысловасці СССР быў годам далейшага росту і на колькасных, і па якасных паказальніках.

Што мы маем у выніку 1933 г. па БССР?

У галіне прамысловасці мы вышлі са значна горшымі паказальнікамі, чым на ўсяму Совецкаму Саюзу. На некаторых галінах прамысловасці мы не дабіліся павышэння прадукцыі супроць 1932 г., а асталіся або на ўзроўні 1932 г., або нават яшчэ ніжэй, чым у 1932 г. Напрыклад, на швэйнай прамысловасці ў 1933 г. мы маем выкананне плана на 73,1 проц. (я гавару аб беларускай), на скурана-абутковай прамысловасці — на 81,5 проц., па галантарэйнай — на 73,5 проц., па мучнічнай — на 98,2 проц., па БелКМО (гэта прамысловасць НКСнаба) — на 99 проц., па будматэрыялах і мясцовай прамысловасці, а таксама па сампрмаапераціі мы маем па некаторых галінах недавыкананне промфінплана ў 1933 г. і не дацягнулі да ўзроўню прадукцыі 1932 г. Напрыклад, дрэваапрацоўка — 43,4 проц. (я маю на ўвазе Лессампрамсаюз). Па будматэрыялах мы таксама недавыканалі праграму.

Прарывы па тэхніх галінах прамысловасці, асабліва па швэйнай (замест 166,6 млн. руб. у 1932 г. выканалі 118,8 млн. руб. у 1933 г., г. зн. менш на 43,8 млн. руб.) прывялі да таго, што, прадукцыя ўсёй прамысловасці па БССР склала 98,5 проц. супроць выкананай прадукцыі ў 1932 г., г. зн. на 14,6 млн. руб. мы выканалі менш, чым у 1932 г.

Праўда, самы буйны прарыў гэта па прадукцыі швэйнай прамысловасці, які атрымаўся яшчэ і таму, што ў сярэдзіне 1933 г. нам прышлося скараціць па прапанове НКЛегпрома Саюза праграму выпрапоўкі па швэйнай прамысловасці на 23 млн. руб. Але гэта ніяк не вызваляе нас ад ацэнкі як нездавальняючай, зусім нездавальняючай работы ў галіне выканання промфін плана.

Варта ўспомніць, што мы закрывалі цэлыя цэхі і нават фабрыкі швэйнай прамысловасці за дрэнны выпуск прадукцыі. Мы закрывалі цэхі ў Віцебску, фабрыку спынялі на некаторы час у Гомелі, таксама і ў другіх гарадах толькі таму, што швэйная прамысловасць псавала сыравіну і давала дрэнную прадукцыю.

А калі ўзяць яшчэ тое, што мы якасныя паказальнікі па ўсіх прамысловых наркаматах, я падкрэсліваю, па ўсіх прамысловых наркаматах, таксама не выканалі, гэта значыць не выканалі задання па зніжэнню сабекошта і павышэнню прадукцыйнасці працы, то зусім стане зразумелым, што ў далейшым такая работа прамысловых наркаматаў, трэстаў, фабрык, заводаў з'яўляецца зусім нецярпімай работай. Па некаторых галінах прамысловасці мы не толькі не знізілі сабекошту, але яго павысілі — гэта па НКЛесу, НКЛегпрому і НКСнабу. Амаль па ўсіх прамысловых наркаматах мы не дабіліся неабходнага павышэння прадукцыйнасці працы. Гэта гаворыць аб дрэннай рабоце. У гэтым годзе мы павінны ўсямерна паляпшаць работу прамысловасці. Вынікі такой дрэннай работы прамысловасці ў 1933 г. з'яўляюцца нічым іншым, як простым вынікам канцылярска-бюракратычных метадаў кіраўніцтва з боку прамысловых наркаматаў і трэстаў. Прарывы з'явіліся таму, што наркаматы і трэсты, усе кіруючыя органы прамысловасці не перабудавалі сваёй работы пановаму, каб жыва і канкрэтна кіраваць справай. Толькі гэтым можна тлумачыць тыя прарывы ў выкананні промфінплана, якія мы мелі ў 1933 годзе. Гэтыя ўрокі мы павінны ўлічыць, каб падцягнуцца ў гэтым годзе, ліквідаваць прарывы 1933 г. па прамысловасці.

У галіне сельскай гаспадаркі СССР 1933 г. прынёс надзвычай вялікія дасягненні. Гэты год для сельска-гаспадарчай вытворчасці зрабіўся пераломным годам. Карэнны перавод сельскай гаспадаркі на калгасны шлях, пераўзбраенне яе новай тэхнікай, машынамі і трактарамі, арганізацыя палітаддзелаў пры МТС і соўгасах далі свае вынікі. 1933 год быў рэкордным годам па ўраджаю. Па ўсяму Саюзу збор зернавых хлябоў дасягнуў 898 млн. цэнтн., або больш на 200 млн. цэнтн., чым было ў 1932 г. Асабліва вялікі прырост па пшаніцы і аўсу, г. зн. па галоўнейшых культурах.

На сельскай гаспадарцы БССР у 1933 г. мы таксама маем такія-ж вынікі. Збор ураджаю зернавых культур у нас дасягнуў 2.270,2 тыс. цэнт. супроць 1624 тыс. цэнтн. у 1932 г., або рост на 650 тыс. цэнтн.

Трэба сказаць, што мы разлічваем для БССР 1933 г. зрабіць пераломным годам у галіне развіцця жывёлагадоўлі. Нельга сказаць, каб мы дабіліся тут поспехаў. Агульнае на галоўе ўсёй жывёлы мы не павялічылі, а яно крыху скарацілася. Толькі ў некаторых галінах жывёлагадоўлі пералом пашоў у станоўчы бок. Па асобных відах жывёлы мы дабіліся некаторага невялікага прросту ўсяго пагалоўя. Буйнай рагатай жывёлы ў нас стала процантаў на 7 больш чым было ў 1932 г. Асабліва прыкметна вырасла пагалоўе буйнай рагатай жывёлы ў калгасах і калгаснікаў, але прыкметна паменшылася колькасць буйнай рагатай жывёлы ў аднаасобнікаў і складае ўсяго 83,6 проц. супроць паяўнай рагатай жывёлы ў аднаасобнікаў у 1932 г. Лік кароў сярод агульнага пагалоўя буйнай рагатай жывёлы ў 1933 г. зменшыўся па ўсіх сектарах, і каро вы складаюць усяго 98,6 проц. да пагалоўя 1932 года. Аб чым гэта гаворыць? Гэта гаворыць аб тым, што ў нас ёсць некаторыя поспехі па захаванню маладняка, што і дало агульны прырост пагалоўя рагатай жывёлы, але ў нас была слабая барацьба ў 1933 г. за карову і наогул слабае вырошчванне маладняка.

Агульнае пагалоўе свіней у 1933 г. складае 96,3 проц. да агульнага пагалоўя 1932 г., а па конях — 97,95 проц. Як бачыце, па буйнай рагатай жывёле ёсць невялікі рост, а па конях і свіннях у нас ёсць памяншэнне. Характэрным з'яўляецца тое, што ў калгасах і ў калгаснікаў пагалоўе вырасла — і па конях, і па каровах, і па свіннях. Значыць найбольшы процант скарачэння дае аднаасобны сектар.

Характэрным дасягненнем у 1933 годзе як па ўсяму Саюзу ў цэлым, так і па БССР з'яўляецца тое, што мы датэрмінова выканалі план хлеба і бульбапаставак. Гэты год быў годам пасяховай работы па выкананню абавязкаў перад дзяржавай па хлеба і бульбапастаўках. Толькі на загатоўках ільну мы ў БССР адсталі і па сёнешні дзень выканалі план толькі на 83,7 проц. Гэта гаворыць аб тым, што барацьба за лён у нас яшчэ слабая і ў цэнтры і на мясцах — у раёнах, сельсоветах, калгасах. З гэтага мы павінны зрабіць адпаведны вывад.

Выпраўляючы дапушчаныя памылкі ў кіраванні сельскай гаспадаркай, якія былі паказаны нам, мы ў 1933 годзе дабіліся поспехаў на многіх галінах сельскай гаспадаркі, выключаючы асваенне тэхнічных культур і ў першую чаргу ільну, дзе мы не дабіліся поспехаў і цягнуліся з прарывамі. Работа ў гэтай галіне ў 1934 г. павінна быць рашуча рэарганізавана. Мы павінны, чаго-б гэта ні каштавала, аўладаць ільном, як адной з вядучых культур у беларускай сельскай гаспадарцы, культурай, якая дае сыравую базу для развіцця нашай індустрыі і на другую пяцігодку. Нашых поспехаў у сельскай гаспадарцы ў 1933 г. мы дабіліся толькі дзякуючы наступнаму: адбываецца безумоўнае ўзмацнен не калгасаў, разгарнулася барацьба за большэвіцкія калгасы, за заможнае калгаснае жыццё, за ліквідацыю кулацкіх элементаў. 1933 год прынёс нам поспехі ў сельскай гаспадарцы дзякуючы таму, што партыя арганізавала палітаддзелы пры МТС і соўгасах, якія ўжо адыгралі важную ролю ў справе паладжвання канкрэтнага кіраўніцтва калгаснай вытворчасцю. Апрача таго, у нас узнялася арганізаванасць калгаснай масы і асабліва калгаснага актыва. Узмацнілася дысцыпліна калгаснай працы і барацьба за калгасную маемасць.

Наша задача заключаецца ў тым, каб улічыць вопыт 1933 г. і ўжо зараз, не адкладваючы ні на адну мінуту, усебакова арганізаваццa, каб гэтыя дасягненні замацаваць і далей іх разгортваць на працягу ўсяго 1934 г.

Як я раней, таварышы, указваў, народна-гаспадарчы план 1934 г. выходзіць як з вынікаў выканання плана 1933 г., таксама і з асноўных задач другой пяцігодкі. Што-ж гэта за асноўныя задачы другой пяцігодкі, якія мы абавязкова павінны ўлічыць пры складанні і зацвярджэнні народна-гаспадарчага плана на 1934 г.? Гэтыя асноўныя задачы другой пяцігодкі пастаўлены і вызначаны ў дакладах т. т. **Сталіна** і **Молатава** на XVII з'ездзе і ў пастановах XVII з'езда ВКП(б). Яны заключаюцца ў наступным:

> «Першая і разам з тым асноўная палітычная задача другой пяцігодкі — канчатковая ліквідацыя капіталістычных элементаў і класаў наогул, поўнае знішчэнне прычын, якія параджаюць класавую розносць і эксплаатацыю, перамаганне перажыткаў капіталізма ў эканоміцы і свядомасці людзей, ператварэнне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў свядомых і актыўных будаўнікоў бясклассавага соцыялістычнага грамадства» (XVII партканферэнцыя).

Другая задача — далейшы ўздым добрабыту рабочых і калгасных мас і павышэнне ўзроўню спажывання працоўных у 2½—3 разы.

Трэцяя задача — завяршэнне тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі — прамысловасці, транспарта, сельскай гаспадаркі.

Гэтыя тры задачы непарыўна звязаны паміж сабой і вызначаюць сутнасць соцыялістычнага будаўніцтва ў перыяд другой пяцігодкі.

Галоўнай гаспадарчай задачай другой пяцігодкі з'яўляецца завяршэнне тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі і на гэтай аснове магутнае разгортванне вытворчых сіл краіны.

> «Мы ставім сваёй задачай забяспечыць правядзенне тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі ўласнымі сіламі совецкага машынабудаўніцтва. У гэтых адносінах другая пяцігодка будзе ў корані адрозніваццa ад першай». (З даклада тав. Молатава на XVII з'ездзе ВКП(б).

Канкрэтныя задачы другой пяцігодкі я агалашаю ў агульных лічбах для таго, каб мы маглі ўявіць задачы 1934 г.

Прадукцыя прамысловасці па ўсяму Саюзу павінна будзе вырасці з 43 млрд. руб. у канцы першай пяцігодкі да 92,7 млрд. руб. у канцы другой пяцігодкі (г. зн. у 1937 годзе), або павялічваецца ў 2,1 раза.

Тут я адну хвіліначку спынюся, таварышы. Калі вы памятаеце, у тэзісах аб другой пяцігодцы да XVII з'езда партыі, якія былі надрукаваны перад з'ездам, значыўся агульны аб'ём валавой прадукцыі прамысловасці ў 103,3 млрд. руб. З'ездам прынята 92,7 млрд. руб.

Агульны сярэднегадавы прырост прадукцыі прамысловасці вызначаўся тэзісамі на 19 проц., а з'езд прыняў 16,5 проц.

З выступленняў на з'ездзе і заключнай прамовы тав. Молатава вы маглі зразумець, чаму XVII з'езд стаў на такі шлях.

Галоўнае заключаецца ў тым, што наша партыя і ўрад Саюза бяруць для сябе заданні, якія будуць выкананы пры любых умовах.

Вы ведаеце, што мы і другую пяцігодку будзем ажыццяўляць у капіталістычным акружэнні, усякія печы капасці могуць быць, труднасці і ў другой пяцігодцы будуць сустракацца.

Задача заключаецца ў тым, каб вы значыць такія тэмпы росту прадукцыі народнай гаспадаркі, у тым ліку і прамысловасці, выкананне якіх было-б гарантавана пры любых умовах, пры самых неспрыяючых. Адначасова нам, ніхто не забаранае ў гадавых планах другой пяцігодкі праектаваць павышаныя тэмпы і мы будзем гэта рабіць.

Як вы памятаеце, у дакладзе тав. Сталіна на аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК у студзені 1933 г. вызначаўся сярэднягадавы прырост прамысловай прадукцыі для другой пяцігодкі ў 13-14 проц. Прайшло нямнога часу і ў нас з'явілася магчымасць зап

# Працяг даклада тав. М. М. ГАЛАДЗЕДА

Я вам, таварышы, указаў, што капіталаўкладанні ў народную гаспадарку ў другую пяцігодку будуць складаць 133,4 млрд. руб. супроць 50,5 млрд. руб. у першай пяцігодцы. Як бачыце, больш чым у 2½ разы павялічаны капіталаўкладанні на другую пяцігодку.

Па сельскай гаспадарцы галоўнымі задачамі на другую пяцігодку з'яўляецца развіццё жывёлагадоўлі і ўздым ураджайнасці зернавых і тэхнічных культур, а таксама поўнае завяршэнне калектывізацыі на працягу другой пяцігодкі. Асабліва вылучаецца задача развіцця жывёлагадоўлі.

З тых лічбаў, якія агаласіў тав. Сталін ў сваім дакладзе на XVII з'езд, па ўсяму Совецкаму Саюзу і з тых кароценькіх лічбаў, якія я вам агаласіў па БССР, відаць, што ў нас жывёлагадоўля патрабуе аграмаднай увагі, што за яе трэба ўзяцца пасапраўднаму, пабольшэвіцку і вынукліць яе як галоўную задачу развіцця сельскай гаспадаркі. Таму тав. Сталін у сваім дакладзе на з'ездзе сказаў:

«Справу жывёлагадоўлі павінны ўзяць у свае рукі ўся партыя, усе работнікі, партыйныя і беспартыйныя, маючы на ўвазе, што праблема жывёлагадоўлі з'яўляецца такой-жа першачарговай праблемай, якой была ўчора ўжо вырашаная з поспехам праблема зернавая. Няма чаго і даказваць, што совецкія людзі, браўшыя не адну сур'ёзную перашкоду на шляху да мэты, змогуць узяць і гэту перашкоду».

З гэтага відаць, што тав. Сталін ставіць для ўсіх праблему жывёлагадоўлі, як галоўную задачу развіцця сельскай гаспадаркі і што за вырашэнне яе павінны ўзяцца ўся партыя і ўсе работнікі — і партыйныя, і беспартыйныя.

Вось, таварышы, выходныя задачы другой пяцігодкі. Выходзячы з гэтых задач другой пяцігодкі, мы вызначылі і задачы плана БССР на 1934 г.

**Галоўныя канкрэтныя задачы плана народнай гаспадаркі БССР на 1934 г.** наступныя:

Па энергетыцы: магутнасць электрастанцый па БССР мы вызначаем павялічыць на 18,2 проц., г. зн. давесці з 64,8 тыс. квт. у 1933 г. да 76,6 тыс. квт. у 1934 г., у тым ліку раённыя электрастанцыі з 20 тыс. квт., да 26,4 тыс. квт., фабрычна-заводскія крыху зменшаюцца ў сваёй магутнасці, бо некаторыя фабрычна-заводскія ўстаноўкі закансервіруюцца і гэтыя прадпрыемствы будуць уключаны ў снабжэнне электраэнергіяй з раённых электрастанцый. Значна расце магутнасць мясцовых электрастанцый: з 18,4 тыс. квт. да 23,4 тыс. квт., або павелічэнне на 27,2 проц.

Усё гэта дасць нам разам павелічэнне электраэнергіі з 217,7 млн. квт.-гадзін да 281 млн., або павелічэнне на 29,1 проц. выпрацоўкі электраэнергіі ў 1934 г. Галоўнае павелічэнне прыпадае на раённыя электрастанцыі — 52,7 проц. і ўсё гэта мяняе спажыванне электраэнергіі. Калі ў 1933 г. на адну душу насельніцтва мы выпрацоўвалі 38,97 квт., то ў 1934 г. мы будзем выпрацоўваць 49,17 квт., або рост на 26,2 проц.

З найбольш важных пабудоў электрабудаўніцтва і павінен адзначыць другую чаргу Асінбуда. У гэтым годзе мы праектуем укласці 3 млн. руб. для таго, каб разгарнуць работу па будаўніцтву другой чаргі Асінаўскай электрастанцыі і каб ужо ў 1934 г. давесці яе магутнасць да 32 тыс. квт. Зараз магутнасць Асінаўскай электрастанцыі 20 тыс. квт.

Значна рэканструіруецца Гомельская электрастанцыя. Арганізуем мы будаўніцтва і раду дробных раённых электрастанцый. Адну заўвагу хачу зрабіць, таварышы, старшыні РВК. Мы будзем будаваць у Слуцку, Мазыры і т. д. электрастанцыі, але трэба паняволіць, каб з вамі не здарылася таго, што было ў Старобінскай арганізацыі. Пачалі яны будаваць электрастанцыю коштам у 50 тыс. руб., а зараз яна ўзляцела ўжо ў 950 тыс. руб.

ЧАРВЯКОЎ: Як кажуць, ліха бяда пачаткам.

ГАЛАДЗЕД: Так, ліха бяда пачаткам. А потым ужо не спыніш. Праўда, тут аказаліся інжынеры-авантурысты і яны так напраектавалі, што потым прышлося перапраектоўваць, але нам адгэтага не лягчэй, прычым станцыя так паб'давана, што электраэнергія поўнасцю не будзе скарыстана.

Пры будаўніцтве электрастанцыі, асабліва ў раёнах, неабходна, каб РВК максімальна звярнулі ўвагу на гэта будаўніцтва, бо яно ў іх галоўнае будаўніцтва.

Па прамысловасці мы ў народнагаспадарчым плане вызначаем прырост прадукцыі ў цэнах 1926-27 г. на 25,3 проц., у тым ліку прадукцыя саюзнай прамысловасці павінна вырасці на 22,8 проц., рэспубліканскай—на 18,2, у тым ліку па НКЦяжпрому—на 33,4, па НКЛегпрому—на 10,0, па НКСнабу—32,7 проц., НКЛесу—на 117,8 проц. Па агул прадукцыю прамысловасці ўсіх відаў і па ўсіх наркаматах такім чынам мы вызначаем у 1308,4 млн. руб. супроць 1044 млн. руб. у 1933 г.

Як бачыце, праектаванне смелае і вялікае.

Народна-гаспадарчым планам Саюза прырост прамысловай прадукцыі на 1934 г. запраектаван у 19,5 проц., мы праектуем у 25,3 проц. — значна больш, а калі ўлічыць работу ў 1933 г. па выкананню промфінплана, то тут задача вельмі вялікая. Трэба яшчэ ўлічыць, што за перчы квартал па некаторых галінах прамысловасці справа прахо- дзіць не зусім важна: некаторыя прадпрыемствы недавыконваюць за данняў першага квартала. Тут нашым советам, РВК, наркаматам, трэстам, усім партыйным, грамадскім, совецкім арганізацыям прадстаіць гіганцкая работа.

Прырост па мясцовай прамысловасці мы вызначаем у 28,5 проц., а па кааператыўнай—у 38,8 проц. Задачы вялікія. Трэба аўладаць гэтымі задачамі.

Адначасова з колькаснымі заданнямі мы вызначаем далейшы рост якасных паказальнікаў, павышэнне прадукцыйнасці працы па рэспубліканскай прамысловасці мы намячаем у 7,2 проц., у тым ліку па прамысловасці НКЦяжпрома ў 19,9 проц., НКЛегпрома—2,0 проц., НКСнаба—10,4 проц.

Зніжэнне сабекошту па рэспубліканскай прамысловасці НКЦяжпрома мы намячаем у 14,8 проц., НКЛегпрома—1,88 і па прамысловасці НКСнаба—2,0. Мы ўзялі асцярожна заданні, як бачыце, але, таварышы, мы сур'ёзна абгаварвалі гэта пытанне, спрачаліся, хацелася даць большыя заданні па якасных паказальніках, але, як бачыце, яны не вялікія. Затое мы будзем патрабаваць ад кожнага наркома, дырэктара трэста, дырэктара фабрыкі і завода, дырэктара цэха, ад кожнага рабочага сапраўднага, добрасумленнага выканання гэтых якасных паказальнікаў, бо якасныя паказальнікі з'яўляюцца той крыніцай паскарэння капіталаўкладанняў, якой мы праектуем. Недавыкананне зніжэння сабекошту на 1 проц. ужо цягне за сабой сотні тысяч, мільёны рублёў страт; непавышэнне прадукцыйнасці працы на аднаго рабочага ўжо зрывае нам аб'ём валавой прадукцыі. Гэта адбіваецца і на фінансавым плане.

З другіх пытанняў, звязаных з выкананнем плана на 1934 г. па прамысловасці, я хацеў-бы яшчэ спыніцца толькі на адным: на арганізацыі працы і рабочага дня. Таварышы, у нас, у БССР ужо больш паловы прамысловасці пераведзена на 7-гадзінны рабочы дзень і намнога прадпрыемстваў асталося на 8-гадзінным дні, але няма ні аднаго прадпрыемства, дзе-б рабочы працаваў поўныя 7 гадзін.

На вялікі жаль, у нас арганізацыя рабочага часу стаіць па нізкім узроўні: рабочыя працуюць у суткі 5 гадзін, 6 гадзін—максімум, а ёсць дзе працуюць і 4½ гадзіны. Гэта атрымалася таму, што нашы гаспадарнікі, нашы прафесіянальныя арганізацыі і партыйныя арганізацыі не разумеюць часам важнасці задачы запаўнення рабочага часу.

Што значыць 7-гадзінны рабочы дзень? Такога дасягнення няма ні у адной краіне і не будзе ні ў адной краіне, пакуль там будзе панаваць капіталістычная сістэма вытворчасці. У нас рабочы працуе 7 гадзін, але калі ён балтаецца 2 гадзіны, а толькі 5 гадзін працуе на вытворчасці, то гэта азначае растачаць народнае дабро, гэта азначае жыць за кошт дзяржавы.

Але тут нельга абвінавачваць толькі саміх рабочых — гэта было-б няправільна. Зразумела, мы павінны апеліраваць і да свядомасці рабочых і будзем апеліраваць, але галоўная віна ляжыць на гаспадарніках, на профсаюзных арганізацыях, якія не могуць арганізаваць рабочы час. А на гэтым мы трацім велізарнейшыя рэзервы. На гэтым дзяржава нясе страты і прамысловасць недавыконвае сваіх планаў.

Па сельскай гаспадарцы мы ставім на 1934 г. наступныя задачы: прырост пасеўнай плошчы на 3,2 проц., прычым прырост азімых на 6,1 проц., а яравога кліна на 1,8 проц. Такім чынам, уся плошча павінна павялічыцца з 3711 тыс. га ў 1933 г. да 3827 тыс. у 1934 г.

Значны прырост пасеўнай плошчы мы намячаем па калгасах і соўгасах. Напрыклад, па соўгасах на 12,4 проц., па калгасах—12,5 проц., па аднаасобнаму сектару ў нас зніжэнне пасеўнай плошчы—на 9,0 проц.

Гэтыя задачы вялікія і за іх трэба біцца.

Чаму я падкрэсліваю, што за іх трэба біцца? Таму, што, не ў крыўду будзь сказана, некаторыя раёны ў нас усвоілі другую тактыку: яны і вясной і ўвосень, калі трэба сеяць і загатаўляць, звычайна рэпетыруюцца на пісанні даклад ных запісак у ЦК і СНК на тэму аб тым, што ў іх такога, як вызначана, пасеўнага кліна няма і патрабуюць яго зменшыць. А мы ставім задачу пашырэння пасеўнай плошчы за кошт цаліны і неабжытых земель. Нам нельга цярпець такога становішча, калі план ўздыму цаліны, раскарчоўкі з года ў год зрываецца, прычым некаторыя раёвыканкомы і земельныя органы не займаюцца гэтай справай. Яны механічна спускаюць гэтыя заданні па калгасах і не правяраюць іх выканання. Калі хочаце, справа пашырэння пасеўнай плошчы за кошт новых земель за апошнія гады праходзіла самацёкам: самі калгаснікі, самі сяляне біліся за гэту справу паміма волі некаторых райвыканкомаў, паміма земельных аддзелаў і інш. земельных органаў.

Вялікія задачы мы ставім і па павышэнню ўраджайнасці па 1934 г. Галоўная з іх заключаецца ў тым, каб замацаваць узровень ураджаю, які дасягнут намі ў 1933 г. Гэта галоўная задача, бо ўраджай 1933 г. быў рэкордным ураджаем, ён вышэй ураджаю 1930 г., вышэй ураджаю 1913 г. І вось задача заключаецца ў тым, каб замацаваць гэты ўзровень ураджаю.

Такім чынам, па азімаму жыту мы плануем павышэнне ўраджаю ўсяго на 0,2 цэнтр. Было 9,4 цэнтр., а мы ставім задачу—9,6 цэнтр. Па пшаніцы—стабільна: астаўляем 11 цэнтр, па яравых—амаль стабільна. Па аўсу павялічваем з 8,7 цэнтн. да 9 цэнтн., па ячменю—амаль стабільна, трошкі павышаем, па бабовых таксама павышаем, па бульбе значна павышаем: з 99,5 цэнтн. у 1933 г. да 105 цэнтн. у 1934 г. Значнае павышэнне ўраджайнасці вызначаем па кораньплодах: з 122 цэнт. да 166 цэнт. Па ільнавалакну таксама ставім вялікую задачу—а 2,4 цэнтн. павысіць да 3 цэнтн. А вам вядома, што на другую пяцігодку мы запраектавалі размер ураджаю ільнавалакна ў 3,2 цэнтн. Ільнасемя — на летаннім ўзроўні. Канопласемя і валакно застаецца на ўзроўні мінулага года.

Выходзячы з дырэктыў тав. Сталіна і рашэнняў XVII з'езда партыі, мы ставім сур'ёзныя задачы па павышэнню пагалоўя ўсіх відаў жывёлы.

Вось якія заданні мы вызначылі для 1934 г.: лік коняй павялічыць на 5,4 проц. У соўгасах гэта пагалоўе коняй павінна павялічыцца па 8,0 проц., у калгасах — на 6,5 проц., у фермах—на 33,4 проц. У аднаасобным сектары павялічыць пагалоўе коняй на 3,7 проц.

Галоўная ўмова выканання гэтага вялікага задання заключаецца ў тым, каб пераламіць апартуністычныя, я сказаў-бы, у радзе месц шкодніцкія, разважанні аб кані.

Да гэтага часу мы не вытрушчалі яшчэ з галоў многіх разгільдяяў шкодніцкай тэорыі аб тым, што з прыходам трактара конь нам не патрэбен. Такія тэорыйкі па Беларусі гуляюць. Калі мы да канца вытрушчым гэтыя не нашы, шкодніцкія тэорыі і пасапраўднаму мабілізуем калгаснікаў, аднаасобнікаў, усіх рабочых соўгасаў і работнікаў земельных і совецкіх органаў, то мы гарантуем выкананне прыросту пагалоўя на паказаны процант, які я ўказаў.

Па буйной рагатай жывёле мы ставім гіганцкія задачы: прырост для 1934 г. на 17,6 проц., у тым ліку ў соўгасах на 22,0 проц., на 23 проц. у калгасах, на 20,2 проц. на фермах, у калгаснікаў прырост будзе най рагатай жывёлы павінен складаць 11,9 проц., а ў аднаасобнікаў —17,5 проц. З агульнага пагалоўя рагатай жывёлы лік кароў павінен павялічыцца на 3,1 проц. Асабліва прырост кароў павінен быць: па соўгасах на 10,6 проц., па калгасах —на 19,5 проц. і па калгасных фермах—на 24,9 проц.

Па свінях (мы-ж свінагадоўчая рэспубліка) мы ставім таксама гіганцкія задачы павялічыць агульнае пагалоўе свіней на 31,8 проц., у тым ліку па соўгасах на 22,8 проц., па калгасах—на 61,3 проц. і па калгасных фермах на 68,6 проц., у саміх калгаснікаў на 40,0 проц., а ў аднаасобнікаў свіное пагалоўе павінна павялічыцца на 15 проц.

Вось аспоўныя задачы па жывёлагадоўлі. Як бачыце, яны выражаны ў народнагаспадарчым плане ў кароткіх лічбах, але гэтыя лічбы гавораць аб многім. Яны сапраўды натрабуюць ад нас большэвіцкай сталінскай барацьбы за праблемы жывёлагадоўлі.

У сувязі з такімі заданнямі па павышэнню пагалоўя, усплывае, як першачарговая задача,—работа над стварэннем кармовай базы. Кармовая база ў нас слабая, прычым не таму, што няма ўмоў для яе ўзмацнення, а таму, што мы дрэнна працуем над ўмацаваннем кармовай базы, прычым нашы арганомы таксама кульгаюць тут па абедзве нагі, не змагаюцца пасовецку за стварэнне моцнай кармовай базы, а без кармовай базы няма чаго і трапаць языком аб развіцці жывёлагадоўлі, бо не будзе гэтага развіцця. Таму мы ўжо ў гэтым годзе як адну з першачарговых задач ставім задачу барацьбы за кармовую базу. Мы нават плануем колькі і дзе дабіцца адводу выпасаў. Мы ставім задачу ўвядзення новых кармовых культур. Што гэта за новыя кармовыя культуры? У першую чаргу не абходна ўзяцца за тапінамбур. У мінулым годзе соўгасы і калгасы сарвалі нам план пасеву тапінамбура. Напэўна многія з членаў сесіі ўзяляюць, што гэта за культура. Гэта, кажуць, сур'ёзная культура не толькі з пункту гледжання пашырэння кармовай базы, але і як харчовая культура, якая можа адыграць сур'ёзную ролю ў развіцці харчовай прамысловасці. Прычым там, дзе лянівыя людзі, яна асабліва добрая, бо можна ўвосень не капаць яе, накіпуць зімаваць у зямлі, а вясной яна ад перазімоўкі ў зямлі становіцца лепшай (смех). Це трэба яе сеяць кожны год, хопіць аднаго пасеву, прыблізна на 7-10 год. А калі тапінамбур увесці ў свінагадоўчых фермах, то пры недахваце рабочых рук можна не капаць яе, а пускаць свіней на поле, яны будуць самі капацца. Можна і ўвесну пускаць свіней, і яна ўслед за гэтым будзе зноў расці да восені. Гэта культура мае вялікую цукровасць і крухмалістасць. Калі не хапае насення, то зараз ужо па Турскай вопытна-даследчай станцыі знайшлі спосаб разводзіць гэты тапінамбур чаранкамі: адразаюцца чаранкі, саджаюцца і пачынаюць расці. Гэта культура ў сваю чаргу патрабуе гаспадарчага догляду. Чаму? Бо калі да яе не пагаспадарску падыйсці, яна можа аказацца самым сур'ёзным пустазеллем для другіх культур. Значыць, усё-ж гаспадарчыя адносіны да яе патрэбны для таго, каб не засмечваць палі другіх культур.

У галіне механізацыі сельскай гаспадаркі 1934 г. у нас будзе годам далейшых і рашучых поспехаў. Трактарны парк БССР павінен павялічыцца да 71.064 конскіх сіл супроць 39.520 конскіх сіл у мінулым годзе, г. зн. прырасці на 79,8 проц. Гэта—гіганцкі рост, амаль падваенне трактарнага парку. Мы будзем будаваць у 1934 г. 18 МТС і колькасць іх павялічыцца з 63 да 81. Да мая месяца будзе арганізавана 8 новых МТС.

Значнае ўзмацненне намячаецца на азвозу сельска-гаспадарчых машын у сельскую гаспадарку. Апрача таго мы думаем завезці і завезем аўтамашын у 1934 г. 537 штук.

Некалькі фактаў аб задачах капітальнага будаўніцтва. 1934 год з'яўляецца годам вялікай будаўнічай праграмы. План капіталаўкладання ў народную гаспадарку БССР прадугледжвае рост на 36,8 проц. супроць 1933 г. Калі мы абгаварвалі народна-гаспадарчы план у СНК не рад тым, як прадставіць яго на зацвярджэнне сесіі, то ў галіне капітальнага будаўніцтва перад намі стаяла адна задача: асвоіць аб'ём капіталаўкладанняў, а гэты аб'ём вымяраецца ў 285,8 млн. руб. супроць 208,9 млн. руб. у 1933 г. У мінулым годзе мы не толькі дапусцілі прарыў у выкананні промфінплана, але і ў капітальным будаўніцтве. Таму галоўная задача і чаго нам сесіі ЦВК, і ўсіх гаспадарчых і совецкіх работнікаў заключаецца сёння не ў тым, каб біцца і тарга- ваецца за лішні рубель для той ці іншай галіны народнай гаспадаркі, для таго, ці іншага раёна або горада, а галоўная задача заключаецца ў тым, каб асвоіць тыя аграмадныя капіталаўкладанні, якія намі вызначаны.

Вопыт мінулага года паказаў, што якраз тыя раёны, якія больш за ўсё біліся за лішнюю тысячу руб ёў, горш за ўсіх скарысталі тыя сродкі, якія былі асігнаваны па плану 1933 г. Нам у СНК прыходзілася ўжо ў снежані і лістападзе сядзець і думаць, як скарыстаць сродкі, якія былі вызначаны планам, бо гэта ганьба, калі год праходзіць, а ў нас не скарыстаны сродкі па капітальнаму будаўніцтву. Мы сталі на такі шлях, што перакідвалі некаторыя сродкі з адной галіны гаспадаркі ў другую, з аднаго раёна ў другі. Гэта значыць падбіралі сродкі ў дрэнных гаспадароў і давалі лепшым. Я це буду агалашаць аб'ём капіталаўкладанняў падрабязна па асобных галінах прамысловасці і сельскай гаспадаркі, пакажу толькі на аспоўнае. Капіталаўкладанні ў прамысловае будаўніцтва растуць на 57,4 проц., прычым па групе «А» —на 43,0 проц., а па групе «Б» (гэта значыць па групе выробляючай сродкі спажывання) рост капіталаўкладанняў складае 72,8 проц.

Як бачыце, у нас дырэктыва аб падваенні і патраенні вырабу прад метаў шырокага спажывання дае задаваленні патрэб шырокіх працоўных мас ужо знаходзіць свой ад бітак у плане 1934 г. Структура прамысловасці БССР такая, што па ўдзельнай вазе пераважае лёгкая прамысловасць, выробляючая сродкі спажывання. Структура ўсіх капіталаўкладанняў 1934 г. выглядае наступным чынам: у прамысловасць накіроўваецца 40,07 проц. усіх капіталаўкладанняў супроць 35,61 проц. у 1933 г., у сельскую гас падарку—19,58 проц., супроць 20,94 проц. у 1933 г. Як бачыце, тут удзельная вага крыху зменшаецца. Зменшаецца ўдзельная вага капіталаўкладанняў у транспарт і сувязь з 26,86 проц. да 16,95 проц., расце па соцыяльна-культурна-бытовому сектару з 14,22 проц. да 31,08 проц.

Вось аспоўныя паказальнікі па народна-гаспадарчаму плану ў галіне вытворчасці і капітальнага будаўніцтва. Планы вялікія. Мы ўжо прывыклі налічваць прырост процанта дзесяткамі кожны год: па прадукцыі прамысловасці па 25 з лішкам процантаў, прырост пагалоўя жывёлы па ўсіх відах да дзесятка процанта, у галіне капіталаўкладанняў — дзесяткі процантаў. Усё гэта гіганцкія задачы. Калі мы хочам выканаць на справе, а не на словах другую пяцігодку, а 1934 г. з'яўляецца другім годам другой пяцігодкі, то мы павінны выканаць народна-гаспадарчы план па ўсіх паказальніках—і па вытворчасці, і па капіталаўкладаннях, і па колькасці, і па якасці. Дапусціць тое, што ў нас было з выкананнем плана ў галіне прамысловасці ў 1933 г., мы далей гэтага не дапусцім, калі-б гэта і каштавала замены раду кіруючых работнікаў прамысловасці.

Некалькі фактаў аб заданнях плана 1934 г. па павышэнню эканамічнага і культурнага ўзроўню працоўных мас.

Рост рабочых і служачых планам 1934 г. праектуецца на 5,0 проц.: з 530 тыс. чал. да 556 тыс. чал, у тым ліку рост рабочых прамысловасці на 7,65 проц., у будаўніцтве—на 4,04 проц., на транспарце і сувязі — на 3,8 проц., у сельскай гаспадарцы — на 4,8 проц., у тым ліку ў соўгасах прырост рабочых на 5,13 проц.

Рост зарплаты праектуе народна-гаспадарчы план на 4,6 проц. Фонд зарплаты для ўсіх кадравых рабочых рэспубліканскай прамысловасці расце на 14,0 проц., асабліва фонд зарплаты павялічваецца па прамысловасці НКСнаба—на 35,1 проц.

Зніжэнне сабекошту па рэспубліканскай прамысловасці мы вызначаем як адну з галоўных задач, без выканання якой няма чаго думаць аб павышэнні зарплаты, аб узмацненні фінансавага плана прамысловасці. Мы ўжо сталі на такі шлях і будзем яго цвёрда праводзіць, на справе рублём прывучаць нашых гаспадарнікаў выконваць свае задачы. Нам прадстаяла складні план па працы, які, к слову, мы на сесію не паспелі прадставіць.

Дзяржплан патрабаваў, упрашаў, граважаў і ўсё, што хочаце, каб некаторыя наркаматы (яны самі аб сабе тут скажуць па сесіі) прадставілі план па працы.

Дзяржплан і ЦСПСБ з удзелам НКФінансаў склалі план па працы за многія наркаматы і цэнтральныя ўстановы. Ганьба гэтым наркаматам і цэнтральным установам! Некаторыя да гэтага часу яшчэ не прадставілі плана па працы.

Што мы зрабілі? Мы вынеслі пастанову СНК (і праводзім яе) аб закупцы крэдытаў на выплату зарплаты служачым тых устаноў, якія не прадставілі план па працы і паведамілі мясцкомам гэтых устаноў (НКЗемляробства, НКСоўгасаў, яшчэ сякія-такія наркаматы), што пенсіі не атрымаюць таму, што адпаведная частка іх апарата сабатуе ўказанне СНК аб складанні плана па працы і што іх кіраўнікі, кіраўнікі гэтых устаноў не разумеюць важнасці дзяржаўнага задання плана па працы. А без плана працы мы не можам адкрываць крэдыты, не ведаючы, колькі ёсць людзей у той ці іншай установе. Так мы і паведамілі мясцкомам. Мы хочам, проста кажучы, натравіць грамадскасць на гэтых бюракратаў, якія не складаюць планаў працы, натравіць рабочых на іх, сказаўшы рабочым: вось, бачыце, праз каго вашы інтарэсы церпяць, навучыце вашых кіраўнікоў працаваць і абаронець вашы інтарэсы, калі яны самі да гэтага не дадумаліся.

І па многіх іншых пытаннях мы будзем так і стаяць справу: не выканаеш план—не дамо грошай, пенсію не будзе чым плаціць рабочым, і скажам рабочым, што вось ты, рабочы, не атрымліваеш своечасова пенсіі таму, што не ўмеюць кіраўнікі вашай установы працаваць, сарвалі нам работу, нанеслі страту дзяржаве, і пенсіі вам не плацяць. Другога метада ўздзеяння няма. Па-моему, гэта правільны, большэвіцкі метад уздзеяння.

З рабочым класам мы павінны грама і адкрыта гаварыць, мы абараняем яго інтарэсы, у нас няма другіх інтарэсаў, як інтарэсы рабочага класа, інтарэсы працоўных.

Спынюся на пытанні таваразвароту. Таваразварот набывае гіганцкае значэнне. Я не буду паўтарацца. З даклада т. Сталіна вы маглі ўбачыць, што справе развіцця совецкага гандлю і разгортвання таваразвароту партыя надае выключна важнае значэнне і што гэта адзін з важнейшых сродкаў павышэння матэрыяльнага добрабыту працоўных мас горада і вёскі і што гэта адзін з важнейшых сродкаў далейшага зжывання процілегласці паміж горадам і вёскай.

Таму справа разгортвання таваразвароту, а значыць і наладжанне таваразраводзячай і гандлюючай сеткі ў плане 1934 г. цалкам адбіта і мы надаем гэтай справе сур'ёзнейшае значэнне. Мы праектуем прырост прадукцыі шырспажыву на 19,2 проц., у тым ліку па НКЦяжпрому выпрацоўка шырспажыву павінна павялічыцца на 76,8 проц. па НКЛегпрому — 8,2 проц., па НКЛеспрому — 75,9 проц., па НКСнабжэння — 16,9 проц., па Белкаспасаюзу — на 29,3 проц., па саматужнай кааперацыі — на 11,2 проц. і па іншых відах вытворчасці — на 28,3 проц. Разам з гэтым павялічваецца таваразварот на 22,6 проц., у горадзе — на 22,0 проц. і па вёсцы — на 22,8 проц.

Вось галоўныя паказальнікі плана па развіццю таваразвароту. Прадугледжана капітальнае будаўніцтва па гандлюючай сетцы, за што таксама патрэбна будзе біцца пабольшэвіцку, бо ў нас часта гэтаму будаўніцтву, будаўніцтву гандлюючай сеткі, не аддаюць належнай увагі. Сёй-той адвык у нас гандляваць і таму ва многіх былых магазінах зрабілі канторы. Лічаць, што кантора для служачых — лепшая ўстанова, чым добры магазін. Партыя гаворыць па адваротт, трэба разгортваць совецкі гандаль, значыць прыдасцца канторы высяляць і зрабіць магазіны, гэта значыць прывучыць усіх нас пасовецку, значыць пакультурнаму гандляваць, бо разгортванне совецкага гандлю — гэта адзін з важнейшых відаў і сродкаў задавалення запатрабаванняў шырокіх мас спажыўцоў.

Няма ў нас другой сістэмы. Гэта сістэма — совецкі гандаль на данай стадыі — аспоўная. А калі гэта галоўная сістэма — пасур'ёзнаму трэба за яе ўзяцца і навучыцца культурна, пасовецку гандляваць. Сектар таваразвароту цалкам знаходзіцца ў нашых руках, ён абагулены сектар. У нас няма ў сферы таваразвароту прыватнага капітала, калі ёсць, то зусім нязначны, нейкія сотыя процанта, а ўсё знаходзіцца ў руках дзяржавы і кааператыўнай сістэмы, г. зн. дзяржаўны і кааператыўны гандаль з'яўляюцца галоўнымі адказчыкамі перад урадам і перад партыяй за наладжанне совецкага гандлю. Аб гэтым павінны добра памятаць і раённыя працаўнікі.

Чаму я ўпамінаю аб раёнах? Вось чаму. Нам прышлося сям-там таргсінаўскія магазіны ў раёнах разгортваць. Патрэбная справа, гэта нам дае валюту. Дык вось, калі мы абмяркоўвалі сетку таргсінаўскіх магазінаў, ведаеце, многія РВК лічылі, што гэта пусцяк, памяшканне не хацелі выдзяліць, і нам прыходзілася націскаць зверху — дайце лепшыя памяшканні. Але не толькі для таргсіна мы будзем лепшыя магазіны адводзіць, а і для ўсяго нашага совецкага гандлю. Старыя гандлюючыя памяшканні, калі яны падыходзяць, трэба цалкам прадаставіць у распараджэнне кааперацыі і дзяржаўнага гандлю.

Соўнарком Саюза паўат вынес спе цыяльны дэкрэт, што ва ўсіх новабудоўлях у гарадах, па ўсіх будоўлях аўкш 2 паверхаў, або ў 2 паверхі абавязкова павінны быць запраектавана будаўніцтва гандлюючых магазінаў у адным паверсе. Гэта новыпадкова. Гэта цэлая сістэма. Нам патрэбна культурна абстаўіць абслугоўванне спажыўца, каб ён прышоў у чысты, добры магазін, каб з ім абыходзіліся як належыць, пакультурнаму, пасовецкаму. Трэба каб чалавек вышаў з магазіна задаволены тым, што з ім абышліся пакультурна, уважліва, што трэба далі, пагаварылі добра. А ў нас пры выклі так, што калі прыходзіш у кааператыўную краму, дзе тавары ёсць на паліцы, то работнік прылаўка павернецца да цабе бокам, буркне нешта пад нос і, чорт яго ведае, не разбярэш ці ёсць тавар, ці няма тавару. Трэба такіх работнікаў прылаўка, прыказчыкаў, якія не хочуць пакультурнаму абыходзіцца з пакупцом, гнаць ад прылаўка. Гэтыя людзі ўмеюць абыходзіцца ўважліва з пакупцом, бо некаторыя з іх былі старымі прыказчыкамі, якія ў старога купца гандлявалі, яны там бегалі перад пакупцом, на адной нагае варочаліся, калі служылі ў прыватнага капіталіста. З совецкім пакупцом, з рабочымі, па іх погляду, можна абыходзіцца не пакультурнаму, груба і т. д. А мы хочам, каб яны з рабочымі, з калгаснікамі абыходзіліся ветліва, культурна, каб табурэткі паставілі для пакупца, запрашалі сесці і падалі, што трэба. Калі чаго няма — растлумачыць, чаму няма. Ёсць — падай так, каб фунт масла, які прадаеш, не быў брудны, а то ў нас звычайна прадаюць масла бруднае, што гадка за яго ўзяцца. Дзе гэта напісана, каб рабочы або калгаснік, які купляе селядцы, рыбу або масла, каб у селядцах было шмат смецця, ці ў масле бруду. Хоць маленькі кавалак купіць, але трэба, каб гэта было чыстае, свежае і т. д. Мы павінны прывучыць нашу гандлюючую сетку іменна да гэтых элементарных правіл культуры і павінны прывучыць ва што-б там ні стала. Хто не будзе перавыхоўвацца, таго будзем выганяць, замяняць новымі людзьмі. Тут нам павінны дапамагчы калгаснікі і самі рабочыя. На жаль, некаторыя рабочыя не скарджаюцца, што іх дрэнна прымаюць, не скарджаюцца, што брудна ў спажывецкай краме, а яны павінны скарджацца і ў ЦВК, і СНК і ў парт органы. Самі пакупцы павінны сігналізаваць нам і сказаць, што ідзе дрэнна, што яму не падабаецца ў тым ці іншым магазіне. Гэта мае аграмаднае значэнне, а без гэтага мы не навучымся культурна гандляваць.

Апошняе, што я хацеў адзначыць па плану 1934 г. — гэта тое, што нам удалося ў гэтым годзе склаці народна-гаспадарчы план у раённым разрэзе. Вы маеце магчымасць у гэтым годзе атрымаць план свайго раёна, дзе сканцэнтравана ўсё тое, што робіцца ў раёне ўключна да драбнейшых тытулаў будаўніцтва школ, больніц, ясляў і інш. пабудоў. Таксама знойдзеце і выторчыя задані ў раённым разрэзе, апрача жывёлагадоўлі. З улікам жывёлагадоўлі ў нас няважна. Наркамзем і ЦУНГУ не далі яшчэ матэрыяла на жывёлагадоўлі ў раённым разрэзе, а толькі ў рэспубліканскім. Трэба тут адзначыць, што не ўсе раёны аказаліся на належнай вышыні па складанню плана для свайго раёна. Калі Дзяржплан патрабаваў ад іх матэрыял, а некаторыя не далі гэтага матэрыяла, або далі паперы, нікому нічога не гаворачыя.

Для прыкладу хачу прывесці, што Тураўскі РВК аказаўся вышэй галавы на даве за Менскі горсовет па складанню народна-гаспадарчага плана. Ён сапраўды даў узорны план, добра прапрацаваны, разгледжаны на прэзідыуме РВК. Усё падлічана, усё распісана, ведаеце, прыемна паглядзець, відаць, што людзі добрасумленна працавалі і справай займаліся, не балбатуны відаць, а сур'ёзныя людзі. Затое некаторыя горсоветы пашы падкачалі, нічога самі не зразумелі і мы з іх паперак нічога не зразумелі. Прыходзілася цягнуць—давайце-ж, давайце вашы планы. Тав. Голендо будзе выступаць з дакладам, ён на гэтай частцы падрабязна спыніцца. Я буду прасіць яго, каб ён расказаў на сесіі, якія раёны далі добрыя планы развіцця народнай гаспадаркі, а якія раёны прадставілі дрэнныя планы. Ад якасці планаў залежыць кіраўніцтва народнай гаспадаркай. Калі людзі не разбіраюцца пры складанні планаў, то як-жа яны будуць кіраваць выкананнем плана на працягу года, яны не будуць фактычна кіраваць, яны будуць сядзець па паверхні, так-сабе, наогул. А такое кіраўніцтва зараз нікуды не варта. Гэта выпякае з апошніх рашэнняў XVII з'езда партыі. Так-сабе, і наогул — нам непатрэбна, нам патрэбна канкрэтная, няхай маленькая справа, але яе сур'ёзна павінны выконваць усе.

Трэба заадно, таварышы, адзначыць вялікую работу, якую прарабіў Дзяржплан, як яго кіраўнік, так і ўсе работнікі Дзяржплана. Упершыню нам удалося, у звязку з добрай работай Дзяржплана па складанню плана на 1934 г., у гэтым годзе даць план у раённым разрэзе. У тых кніжках, якія вам разданы, вы знойдзеце кожны па свайму раёну (усе старшыні РВК, усе члены ВВК знойдуць кожны па свайму раёну), што ў яго раёне будзе і павін на рабіцца. А што значыць ведаць пра гэта? Гэта значыць ведаць, за што біцца. Звярнуўшыся з сесіі кожны зможа адразу закрупіць там, дзе трэба, будзе мець канкрэтную барацьбу, работу на 1934 г. І тут Дзяржплан аказаў нам вялікую паслугу, пабудаваў план 1934 г. у раённым разрэзе.

## III. АБ АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ ПЕРАБУДОВЕ ПРАЦЫ УСІХ СОВЕЦКА-ГАСПАДАРЧЫХ ОРГАНАЎ

Перайду да апошняй часткі свайго даклада — да арганізацыйных пытанняў.

Мы падводзім вынікі нашай работы за мінулы час, у тым ліку і за 1933 г. і вызначаем вялікія народна-гаспадарчыя задачы на 1934 г., задачы, якія выцякаюць з плана другой пяцігодкі.

Як план усёй другой пяцігодкі, так і план 1934 г. — другога года другой пяцігодкі — ёсць нішто іншае, як праграма вялікіх работ па арганізацыі бяскласавага соцыялістычнага грамадства. Гэта задача не лёгкая і вельмі важная. На шляху яе выканання стаіць немалым труднасці, якія трэба будзе перамагаць, бо перамога, — таварыш тав. Сталін, — сама не прыходзіць, яе трэба працягваць. Гэта значыць, што за перамогу трэба змагацца.

Што-ж гэта за труднасці, якія стаяць перад намі на другую

# Палажэнне аб Камісіі Совецкага Кантроля пры Совеце Народных Камісараў Саюза ССР

## ПРЫНЯТА КАМІСІЯЙ СОВЕЦКАГА КАНТРОЛЯ І ЗАЦВЕРДЖАНА ЦЭНТРАЛЬНЫМ ВЫКАНАЎЧЫМ КАМІТЭТАМ І СОУНАРКОМАМ СССР

1. Камісія Совецкага Кантроля пры Совеце Народных Камісараў Саюза ССР мае сваёй асноўнай задачай сістэматычную, канкрэтную і аператыўную праверку фактычнага выканання важнейшых рашэнняў урада ўсімі звеннямі совецкага і гаспадарчага апарата зверху да нізу.

Камісія Совецкага Кантроля робіць праверку выканання рашэнняў урада ў мэтах:

а) папярэджання прарываў у выкананні рашэнняў урада ў рэзультаце бюракратызма, канцылярщчыны, расхлябанасці і слабасці кіраўніцтва ў совецкім і гаспадарчым апараце;

б) выяўлення скажэнняў у правядзенні ў жыццё рашэнняў урада з боку совецкага і гаспадарчага апарата;

в) выяўлення канкрэтных віноўнікаў указаных вышэй прарываў і скажэнняў;

г) выяўлення недахопаў у галіне падбору і расстаноўкі кіруючых кадраў;

д) прыняцця тэрміновых мер да ўмацавання совецкай дысцыпліны і выпраўлення выяўленых скажэнняў і аператыўных памылак, дапушчаных у працэсе выканання рашэнняў урада.

2. Камісія Совецкага Кантроля праводзіць праверку выканання рашэнняў урада як па заданнях Совета Народных Камісараў Саюза ССР, так і па ўласнай ініцыятыве, канцэнтроўваючы сваю галоўную ўвагу на важнейшых участках гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Камісія Совецкага Кантроля перыядычна адчитваецца ў сваёй рабоце перад Советам Народных Камісараў Саюза ССР.

3. Камісія Совецкага Кантроля сваю работу праводзіць у цеснай сувязі з Камісіяй Партыйнага Кантроля, узгадняючы мерапрыемствы, датычныя сумесных пастаноў Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай комуністычнай партыі (большэвікоў).

4. Склад Камісіі Совецкага Кантроля намячаецца з'ездам Усесаюзнай комуністычнай партыі (большэвікоў) і зацвярджаецца Цэнтральным Выканаўчым Камітэтам і Советам Народных Камісараў Саюза ССР.

Кіраўніком Камісіі Совецкага Кантроля з'яўляецца адзін з намеснікаў старшыні Совета Народных Камісараў Саюза ССР, зацвярджаемы на пасадзе старшыні Камісіі Совецкага Кантроля пастановай Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Совета Народных Камісараў Саюза ССР.

У гэтым-жа парадку зацвярджаецца намеснік старшыні Камісіі Совецкага Кантроля.

5. Пленум Камісіі Совецкага Кантроля збіраецца не радзей аднаго разу ў тры месяцы.

Для кіраўніцтва ўсёй контрольнай работай Камісіі Совецкага Кантроля ў перыяд паміж пасяджаннямі пленума Камісіі Совецкага Кантроля выбірае ў якасці свайго выканаўчага органа Бюро з 11 чалавек, склад якога зацвярджаецца Советам Народных Камісараў Саюза ССР.

6. Члены Камісіі Совецкага Кантроля не могуць сумяшчаць работу ў Камісіі з другой работай у совецкіх і гаспадарчых органах. Адступленні з гэтага правіла дапускаюцца а спецыяльнага ў кожным паасобным выпадку дазволу Совета Народных Камісараў Саюза ССР.

7. Члены Камісіі Совецкага Кантроля маюць права прымаць удзел ва ўсіх пасяджэннях Совета Народных Камісараў Саюза ССР, Совета працы і абароны, камітэтаў і камісій пры Совеце Народных Камісараў Саюза ССР і совеце працы і абароны, а таксама ва ўсіх пасяджэннях другіх цэнтральных і мясцовых совецкіх гаспадарчых органаў.

8. Для выканання ўскладзеных на яе задач Камісія Совецкага Кантроля:

а) праводзіць праверку работы цэнтральных і мясцовых совецкіх і гаспадарчых органаў пад пунктам погляду кантроля выканання рашэнняў урада;

б) патрабуе ад кіраўнікоў, памянёных у п. «а» органаў, правядзення канкрэтных мерапрыемстваў, якія забяспечваюць дакладнае і своечасовае выкананне рашэнняў урада;

в) можа непасрэдна даваць абавязковыя ўказанні адпаведным органам у выпадку яўнага парушэння рашэнняў урада;

г) кантралюе прыём і здачу спраў пры змене кіраўнікоў цэнтральных і мясцовых совецкіх і гаспадарчых органаў, народных камісарыятаў, галоўных кіраўніцтваў, выканаўчых камітэтаў, трэстаў, чыгунак, прамысловых прадпрыемстваў, соўгасаў, машына-трактарных станцый і т. п.;

д) ставіць у вядомасць Совет Народных Камісараў Саюза ССР аб усіх выяўленых выпадках парушэнняў дысцыпліны і скажэнняў у правядзенні ў жыццё рашэнняў урада, а таксама няправільнага падбору і расстаноўкі кіруючых кадраў у совецкім і гаспадарчым апараце.

9. Камісія Совецкага Кантроля прымяняе наступныя меры ў адносінах кіраўнікоў і іншых работн каў совецкага і гаспадарчага апарата, якія зрываюць выкананне рашэнняў урада і парушаюць совецкую дысцыпліну:

а) непасрэдна або праз кіраўнікоў адпаведных органаў накладае на віноўных дысцыплінарныя спагнанні аж да пераводу на ніжэйшую пасаду або звальнення з работы;

б) прыцягвае віноўных праз органы пракуратуры да адказнасці ў судовым парадку.

10. Работнікі совецкага і гаспадарчага апарата, якія выдзяляюцца сваім узорным выкананнем рашэнняў урада, прадстаўляюцца Камісіі Совецкага Кантроля к выпучэнню на больш адказную работу і к узнагароджанню ва ўстаноўленым парадку.

11. Камісія Совецкага Кантроля мае ў саюзных і аўтаномных рэспубліках, краях і абласцях сваіх пастаянных прадстаўнікоў (упаўнаважаных), незалежных ад мясцовых органаў.

Упаўнаважаныя назначаюцца і адклікаюцца Камісіяй Совецкага Кантроля з зацвярджэння Совета Народных Камісараў Саюза ССР. За сваю дзейнасць упаўнаважаныя адказны толькі перад Камісіяй Совецкага Кантроля і Советам Народных Камісараў Саюза ССР.

12. Камісія Совецкага Кантроля спецыяльнай у кожным паасобным выпадку пастановай можа назначаць сваіх упаўнаважаных на месцы:

а) па асобных галінах гаспадаркі (транспарт, чорная металургія і т. п);

б) па асобных раёнах або групах раёнаў.

Упаўнаважаныя Камісіі Совецкага Кантроля па асобных раёнах, або групах раёнаў дзейнічаюць пад кіраўніцтвам упаўнаважаных Камісіі ў адпаведных саюзных і аўтаномных рэспубліках, краях і абласцях.

13. Для выканання ўскладзеных на іх задач упаўнаважаныя Камісіі Совецкага Кантроля:

а) праводзяць праверку работы ўсіх совецкіх і гаспадарчых органаў пад кутом погляду кантроля выканання рашэнняў урада;

б) патрабуюць ад кіраўнікоў, памянёных у п. «а» органаў, правядзення канкрэтных мерапрыемстваў, якія забяспечваюць дакладнае і своечасовае выкананне рашэнняў урада, а ў выпадку неабходнасці ставяць пытанне аб гэтым перад советамі народных камісараў саюзных і аўтаномных рэспублік, выканаўчымі камітэтамі краёў і абласцей або перад Камісіяй Совецкага Кантроля;

в) маюць права, у выпадку яўнага парушэння рашэнняў урада, даваць абавязковыя ўказанні ўсім совецкім і гаспадарчым органам у межах адпаведнай саюзнай або аўтаномнай рэспублікі, края і вобласці;

г) накладаюць непасрэдна ці праз кіраўнікоў адпаведных органаў дысцыплінарныя спагнанні на работнікаў, якія зрываюць выкананне рашэнняў урада і парушаюць совецкую дысцыпліну, аж да пераводу на ніжэйшую пасаду, або звальнення з работы;

д) прыцягваюць віноўных праз органы пракуратуры да адказнасці ў судовым парадку.

14. Упаўнаважаныя Камісіі Совецкага Кантроля абавязаны сістэматычна паведамляць Камісіі Совецкага Кантроля або непасрэдна Совету Народных Камісараў Саюза ССР:

а) аб ходзе выканання на месцах кантралюемых імі рашэнняў урада;

б) аб усіх выпадках парушэння рашэнняў урада совецкімі і гаспадарчымі органамі ў межах адпаведнай саюзнай або аўтаномнай рэспублікі, края ці вобласці;

в) аб выяўленым імі няправільным падборы і расстаноўцы кіруючых кадраў у совецкім і гаспадарчым апараце.

15. Упаўнаважаныя Камісіі Совецкага Кантроля маюць права прымаць удзел ва ўсіх пасяджэннях совецкіх і гаспадарчых органаў у межах адпаведнай саюзнай ці аўтаномнай рэспублікі, края або вобласці.

16. Усе совецкія і гаспадарчыя органы абавязаны, згодна патрабаванню Камісіі Совецкага Кантроля і яе ўпаўнаважаных, прадстаўляць дакументы, справаздачы і іншыя неабходныя матэрыялы.

17. Камісія Совецкага Кантроля і яе ўпаўнаважаныя прыцягваюць да сваёй работы секцыі совета, прафесіянальныя саюзы, інжынерна-тэхнічныя секцыі, арганізацыі Усесаюзнага ленінскага комуністычнага саюза моладзі, калгасны актыў, друк і інш.

18. Цэнтральны апарат Камісіі Совецкага Кантроля складаецца з наступных груп, якія ажыццяўляюць кантроль па асобных галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва:

1) група па народнаму камісарыяту земляробства і загатоўчых арганізацый па зярну;

2) група па каркамату зернавых і жывёлагадоўчых соўгасаў;

3) група машынабудаўніцтва;

4) група электратэхнічнай прамысловасці і электрастанцый;

5) група апалавай прамысловасці;

6) група чорнай металургіі;

7) група каляровай металургіі;

8) група хімічнай прамысловасці;

9) група леса-папяровай прамысловасці і будаўнічых матэрыялаў;

10) група лёгкай прамысловасці (Народны камісарыят лёгкай прамысловасці), промкаапэрацыі і адпаведных загатоўчых арганізацый: Заготлён, Заготбавоўна, Заготскура, Заготшэрсць;

11) група гандлю, харчовай прамысловасці (Народны камісарыят снабжэння, Цэнтрасаюз) і адпаведных загатоўчых арганізацый (Заготжывёла, Табаксырэвіна і т. д.);

12) група чыгуначнага транспарта;

13) група воднага транспарта;

14) група дарожная (Цэнтральнае кіраўніцтва шасейных і грунтовых дарог і аўтамабільнага транспарта);

15) група сувязі і радыёвяшчання;

16) група ваеннага кантроля;

17) група знешняга гандлю;

18) група фінансаў і учоту (Народны камісарыят фінансаў, банкі, цэнтральнае кіраўніцтва народна-гаспадарчага учоту);

19) група адміністратыўных устаноў (выканкомы, народны камісарыят юстыцыі, аб'яднанае дзяржаўнае палітычнае кіраўніцтва і т. д.);

20) група жыллёва-комунальная;

21) група асветы і аховы здароўя;

22) Бюро скаргаў;

23) Сакратарыят.

# ІНСТРУКТАР—ВАЖНЕЙШАЕ ЗВЯНО У АПАРАЦЕ РАЙКОМА

Ужо калля месяца прайшло з дня закрыцця XVII партыйнага з'езда. Гэты тэрмін дастатковы для таго, каб разгарнуць перабудову работы партарганізацый па ўказанням з'езда партыі, але ў пераважнай большасці райкомаў гэта перабудова ідзе вельмі марудна: сядзяць і чакаюць нейкіх папажэнняў, інструкцый, цыркуляраў.

Ліквідаваць сектары — гэта яшчэ не ўсё. Трэба, каб інструктары ў райкомах разгарнулі работу так, як гэта ўказваецца ў рэзалюцыі XVII з'езда па арганізацыях. У радзе райкомаў інструктары больш ся дзяць у райкомах і фактычна прадаўжаюць работу ранейшых сектароў. ГЭТА ЁСЦЬ ФАРМАЛЬНАЕ ПЕРАБУДОВА. Перабудова ПА СУТНАСЦІ — гэта значыць, што інструктар нясе поўную адказнасць за работу партарганізацый, прымацаваных да яго. На XVII з'ездзе ВКП(б) тав. КАГАНОВІЧ указаў, што «...гэтыя інструктары — не інструктары старога пыта, якія прыязджалі ў раёны, правяралі пратакопы партыйнай арганізацыі і не мелі ніякіх праў прыняць на месцы неабходныя меры. Цяпер гэта будзе інструктар, які будзе мець поўную групу тэрытарыяльных партыйных арганізацый і адказваць за іх работу.

Самае важнае цяпер у рабоце інструктара райкома заключаецца ў тым, ШТО ЁН АДКАЗВАЕ ПЕРАД РАЙКОМАМ ЗА ДАРУЧАНЫ ЎЧАСТАК, АПЕРАТЫЎНА ВЫРАШАЕ ПЫТАННЕ НА МЕСЦЫ, ДАПАМАГАЕ ВЫПРАВІЦЬ НЕДАХОПЫ, АРГАНІЗУЕ РАБОТУ ПЕРШАПАЧАТКОВЫХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ.

Рашаючае ў рабоце інструктара—вывучэнне людзей, з якімі ён мае справу, праверка гэтых людзей, падбор і выхаванне кадраў і, перш за ўсё, партыйных кадраў. У сваёй рабоце інструктар павінен заўсёды кіравацца ўказаннямі тав. КАГАНОВІЧА ў яго дакладзе на XVII партыйным з'ездзе, што «ЧЛЕН ПАРТЫІ ПАВІНЕН СТАЯЦЬ У ЦЭНТРЫ РАБОТЫ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ». Інструктары райкомаў павіны ў сваёй рабоце выходзіць з таго, што жывы чалавек і, перш за ўсё, член партыі — рашаючае звяно ў рабоце інструктара райкома. Інструктар павінен ведаць не толькі кіраўнікоў партарганізацыі, але і шырокі партыйны і беспартыйны актыў, ведаць, вывучаць, высвятляць жыццёвыя пытанні работы і барацьбы радавых комуністаў і беспартыйных рабочых. Інструктар абавязан вучыць і практыцы, ДАПАМАГАЧЫ ПАДЫМАЦЬ УСЮ РАБОТУ НІЗАВЫХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ НА БОЛЬШ ВЫСОКІ ІДЭЙНЫ І АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ЎЗРОВЕНЬ.

Інструктар райкома, паўтараем, , цалкам адказвае за работу партарганізацый, прымацаваных да яго. Аднак, гэта не значыць, што інструктар павінен адразу ўхапіцца ЗА ЎСЁ і працаваць ЗА ЎСІХ. Інструктар павінен умець ЗНАЙСЦІ РАШАЮЧАЕ ЗВЯНО, з усёй сумы пытанняў выбраць ГАЛОЎНАЕ з тым, каб ухапіўшыся за яго выцягнуць усю суму пытанняў. Не працаваць за ўсіх на прадпрыемстве, а ДАПАМАГЧЫ парткому і парторгу арганізаваць работу, КАНТРАЛЯВАЦЬ выкананне, ВЫХОЎТАЦЬ нашых работнікаў у духу адказнасці за даручаную ім партыйную работу.

ІНСТРУКТАР — ВАЖНЕЙШАЕ ЗВЯНО Ў АПАРАЦЕ РАЙКОМА. Таму пастаяннае кіраўніцтва інструктарамі і накіраванне іх работы з боку райкома з'яўляецца важнейшай справай. Райкомы павінны быстра вырашаць пытанні, высоўваемыя інструктарамі, нахаду правяраць іх работу, выпраўляць недахопы, падымаць работу інструктара на больш высокі ўзровень.

Для таго, дак дапамагчы нашым райкомам і іх інструктарам разгарнуць работу пановаму, мы паказваем першы вопыт работы інструктароў Ленінскага райкома ў Маскве. Гэты матэрыял складзен паводле справаздачы аб нарадзе, змешчанай у «Рабочей Москве» — орга. МК ВКП(б).

# ЯК ПРАЦУЮЦЬ ІНСТРУКТАРЫ ЛЕНІНСКАГА РАЙКОМА У МАСКВЕ

У канцы лютага ў Ленінскім райкоме ВКП(б) (Масква) адбылася нарада, на якой інструктары райкома дзяліліся ўражаннямі аб першых днях работы ў сувязі з перабудовай.

Тав. **Волкаў**, інструктар электраэнергетычнай і металапрамысловай групы яднае 29 партарганізацый, 1.500 комуністаў. Усю сваю работу ён праводзіць галоўным чынам **непасрэдна ў партыйных арганізацыях.** З раніцы да першай гадзіны дня ён працуе на прадпрыемствах, у цэхах, у партгрупах, а з першай гадзіны дня да чатырох—у райкоме, дзе гутарыць па пытаннях бягучай работы з сакратарамі партарганізацый і дырэктарамі прадпрыемстваў. Почту ён наведвае начныя змены, клубы, гурткі і т. д.

— Я ўважліва прачытаў і прапрацаваў даклады тт. **Сталіна і Кагановіча**,—гаворыць т. Волкаў,—і паставіў перад сабой асноўныя, рашаючыя, першачарговыя пытанні: барацьба за аўладанне тэхнічным мінімумам, падбор інжынерна-тэхнічных кадраў, перабудова профсаюзных арганізацый. Усе гэтыя пытанні ўключаны ў план работы.

Тав. **Джапарыдзе**, інструктар хімічнай і паліграфічнай прамысловасці, за кароткі тэрмін пагавары ла з 23 сакратарамі, і правяла рад аператыўных мерапрыемстваў. Эксперыментальны завод ТЭЖЭ, маючы аграмаднейшае значэнне, не меў памяшкання. Без усякіх пасяджэнняў, узгадненняў, на працягу некалькіх мінут пры дапамозе інструктара Джапарыдзе было вырашана пытанне аб памяшканні для гэтага завода. Завод ужо асвойвае новае памяшканне. На фабрыцы «Новая заря» існавала чатырохступенное кіраўніцтва: парткамітэт, цэх, партгрупа і канвеер. На кожным канвееры ёсць па аднаму комуністу. Некалькі канвеераў аб'яднаны ў адну партгрупу. А парт група яднаецца ў партарганізацыю. Гэта чатырохступенное кіраўніцтва тав. Джапарыдзе ліквідавала і разам з парткомам распрацоўвае мерапрыемствы па перабудове партыйнай работы.

Тав. Джапарыдзе занялася інтэрнатамі для рабочых. Яна ўзяла пад асабісты нагляд дзве кватэры, каб быць у курсе стану інтэрната ў цэлым. У сувязі з тым, што трэція змены астаюцца беспрытульнымі, тав. Джапарыдзе занялася гэтым пытаннем, каб трэція змены ва ўсіх адносінах абслугоўваліся ў такой-жа меры, як першая і другая. Аб шэфстве над вёскай тав. Джапарыдзе выказала такую думку:

— Мне здавалася, было-б падзвычай карысным, каб мы, інструктары, змаглі на працягу аднаго-двух месяцаў выехаць у адзін з калгасаў, над якім шэфствуе прадпрыемства нашай групы, каб мы маглі сапраўды аказваць канкрэтную дапамогу прадпрыемству і ведаць усе куткі яго жыцця.

Тав. **Трафімаў**, інструктар групы гарадскога транспарта і сувязі, аб сваім вопыце расказвае такім чынам:

— Нядаўна я быў у Апакаўскім трампарку ноччу. Я ўбачыў там значныя непаладкі, якія залежаць не ад «аб'ектыўных» прычын, а ад людзей, працуючых там. Я ўмяшаўся ў гэту справу, дапамог расставіць сілы, кіруючыя работнікі пайшлі ў брыгады, у службу рухомага састава. Я дапамог таварышам дастаць гужавы і аўтатранспарт.

Тав. Трафімаў намеціў сабе для наведання тры партарганізацыі. Ён не пашоў да сакратара або да дырэктара, **а пашоў прама ў цэх паглядзець, што там робіцца.** На заводзе ВАРЗ пры начным наведванні ён праверыў, як захоўваецца бульба ў падвалах.

Праверыўшы перабудову партарганізацыі па Апакаўскаму трампарку, тав. Трафімаў пераканаўся ў тым, што калі па гаспадарчай лініі пачалі перабудову, то па партыйнай лініі да гэтай перабудовы яшчэ не прыступілі. Таму ён разам з парткомам заняўся перабудовай работы партыйнай арганізацыі. Апрача таго ім была склікана нарада сакратароў партарганізацый сваёй групы, на якой паставіў перад імі рад пытанняў арганізацыйнай перабудовы.

Тав. **Рубцоў**, інструктар групы вузаўскіх арганізацый, выказаў наступнае меркаванне аб узаемаадносінах з культпропам:

— Цэлы рад членаў партыі вузаўцаў лічаць неабходным з усімі заявамі зварачацца абавязкова ў райком, праз галаву свайго сакратара. Гэта вельмі перашкаджае працаваць. Многія сакратары парт арганізацый ВНУ і навукова-даследчых інстытутаў у сваю чаргу не вырашаюць пытання да таго часу, пакуль яно не вырашыцца ў райкоме. Прыходзіцца сядзець зараз у партарганізацыі, дапамагаць вырашаць тое ці іншае пытанне, вучыць таварышоў большай самастойнасці і асабістай адказнасці. Вузаўскія арганізацыі трэба пакінуць за інструктарам гэтай групы, а не ў культпропе. Мы натрапілі на такі факт: я, як інструктар, хацеў склікаць нараду выклад чыкаў-грамадазнаўцаў. Але гэта справа, кажуць, культпропа, бо на стаўпіцкімі кадрамі павінен займацца культпроп. Тут патрэбна яснасць. Або ВНУ і навукова-даследчыя інстытуты трэба перадаць поўнасцю культпропу, або пакінуць іх за інструктарам і не абмяжоўваць яго поля дзейнасці.

Тав. Рубцоў падае наступны прыклад аператыўнай работы інструктара. Падаў заяву ў райком прафесар **Чыжыкаў** з аднаго навукова-даследчага інстытута. Ён скардзіўся, што, не гледзячы на загад НКЦП, навукова-даследчы інстытут не дапамагае вырашэнню адной навуковай праблемы, распрацоўка якой была яму даручана НКЦП. Гэта пытанне пры старой сістэме трэба было-б, бадай, абавязкова паставіць на бюро райкома. Зараз мы гэта пытанне вырашылі проста: паехалі ў інстытут, дагаварыліся з дырэктарам і сакратаром партарганізацыі. Дабіліся таго, што ўключылі ў кантрольны гэту работу, далі брыгаду работнікаў і зараз прафесар Чыжыкаў спакойна працуе над вырашэннем гэтай праблемы.

Тав. **Ляўданская**, інструктар групы трэстаў і розных наркаматаў сваю работу пачала з вывучэння людзей, з праверкі справы на месцы. Праверыўшы стан партарганізацыі больніцы імя Семашко і выявіўшы там рад ненармальнасцей, непасрэдна на месцы ўсе гэтыя ненармальнасці знішчыла. За невялікі перыяд работы тав. Ляўданская пазнаёмілася з 6 партарганізацыямі, і ў некаторых з іх была ўжо па два разы. У партарганізацыі Швейбазсаюззбыта тав. **Ляўданская** дапамагла разгарнуць пра працоўку матэрыялаў XVII партыйнага з'езда.

Інструктар машынабудаўнічай групы тав. **Аўсеенка** расказаў, як пры яго аператыўным умяшанні было вырашана адно балючае пытанне на заводзе АМО-2.

З АМО-2 я атрымаў сігнал, што з асваеннем новага карбюратара на заводзе справа стаіць дрэнна. Замест 100 штук па плану завод выпускаў 30—40 штук у дзень. Гаварыў я з начальнікам цэха, з брыгадзірам, з канструктарам, з тэхнічным дырэктарам. Правялі тэхнічную нараду, дзе дэталь на ўстанавілі прычыны, якія перашкаджалі асваенню. Прынялі рад аператыўных рашэнняў. За апошнія дні справа некалькі палепшылася, пачынаюць выпускаць па 85 штук карбюратараў. Дабіваюся, каб па завод выдзелілі групу кваліфікаваных таварышоў з «НАТІ» каб яны дапамаглі заводу ў асваенні вытворчасці.

Адказны інструктар групы культуры і аховы здароўя тав. **Камарыцкая** так арганізуе сваю работу:

— Я лічу,—гаворыць яна, — што першапачатковая арганізацыя павінна мець план работы, і я над гэтым зараз працую, дапамагаю ў гэтым. Нарады сакратароў буду збіраць дыферэнцыявана. Напрыклад, паасобных сакратароў школьных партарганізацый, асобных сакратароў больніц і т. д. А самае галоўнае—гэта непасрэднае наведванне гэтых арганізацый і дапамога, інструктаж, аператыўнае ўмяшанне на месцы. Партарганізацыі маёй групы пачынаюць працаваць з раніцы, як совецкія ўстановы. Таму я парашыла бываць у райкоме да першай гадзіны дня, а пасля першай гадзіны ездзіць па прадпрыемствы. Я лічу, што трэба бываць на сходах, у гуртках, на занятках, каб атрымаць больш яснае ўяўленне аб рабоце данай арганізацыі, пазнаёміцца з больш шырокім колам людзей і потым ужо, на гэтай аснове, рабіць адпаведныя вывады і прымаць тыя ці іншыя аператыўныя мерапрыемствы.

# *Канец даклада тав. ГАЛАДЗЕДА*

Патрэціце, неабходна ўстанавіць і мы даб'емся гэтага, чаго-б гэта нам ні каштавала, самай суровай совецкай дысцыпліны сярод усіх работнікаў совецка-гаспадарчага апарата, як сярод партыйцаў, так і беспартыйных. Нельга дапускаць, таварышы, каб у далейшым, у нашым гаспадарчым і совецкім апараце былі расхлябаныя, недысцыплінаваныя людзі, якія адседжваюць свае гадзіны, а такіх элементаў у нас хоць адбаўляй. Таварышы, калі я гавару аб совецкай дысцыпліне, то я маю на ўвазе не толькі акуратнае наведванне заняткаў; гэта само сабой, мы гэтага таксама будзем дабівацца. Я маю на ўвазе і добрасумленнае выкананне сваіх абавязкаў любым совецкім работнікам, дзе-б ён ні працаваў — і партыйцам і беспартыйным. Што-ж атрымліваецца? Скажам, ускрыта намі ў Наркамземе шкодніцтва, ускрыты ў радзе куль турных установаў нандэмаўскія шкодніцкія элементы. Дык вось, комуністаў, асабліва кіруючых мы караем за тое, што яны прашляпілі, што каля іх сядзелі не нашы, а супроцьсовецкія людзі, ворагі нашы, якія падточвалі дзяржаўныя ўстоі ўнутры дзяржаўных устаноў, а іх нашы людзі не бачылі. Мы гаворым, што вы не комуністы, а шляпы, штампоўшчыкі. Гэта мы гаворым у адносінах да тых комуністаў, хто прагледзеў гэту справу, мы зніжаем іх па пасадзе. А совецкія **беспартыйныя** работнікі, якія сядзелі побач са шкоднікамі, яны, бачыце, тут нібыта ні пры чым. Чаму? На якой падставе? Калі ты сур'ёзны, чэсны совецкі работнік, хоць ты і беспартыйны, то ты павінен згарэць з сораму за тое, што ты сядзеў побач у адной установе, калі хочаце, за адным сталом працаваў са шкоднікам, з нашым ворагам, які падкопваў совецкую ўладу і нічога не бачыў, а можа бачыў ды маўчаў. І совецкія беспартыйныя работнікі павінны адказваць за тое, што робіцца ў іх установе, у сектары, у аддзеле. А як-жа інакш? Тады яны-ж не совецкія работнікі, а чыноўнікі, фармальныя людзі, якія служаць совецкай уладзе ў сілу неабходнасці, а не сумленна служаць інтарэсам рабочага класа. Гэта значыць, што яны не думаюць аб класавай пільнасці, не думаюць аб інтарэсах пролетарыята, а адседжваюць толькі свае гадзіны. Таму ўстанаўленне жалезнай совецкай дысцыпліны ў совецкім гаспадарчым апараце мяркуе ўстанаўленне свядомых адносін усіх без выключэння работнікаў совецкага дзяржаўнага апарата да сваіх абавязкаў, мяркуе ўстанаўленне адказнасці кожнага за даручаную яму работу. І так трэба разумець задачы ўстанаўлення свядомых совецкіх адносін да працы ў любой установе, на любым участку.

Пачацвертае, трэба ўстанавіць найсуровейшую адказнасць кожнага работніка, на якой бы рабоце ён ні работаў за выкананне даручанай яму справы; бязлітасна выганяючы абязлічку і хаванне за так званую калегіяльнасць. Трэба ліквідаваць і мы ліквідуем такія агіднасці, калі прадстаўляецца той ці іншы матэрыял у вышэйшую ўстанову, часкам нікім не падпісаны, неахайны, не праверэны, бо шмат хто не хоча падпісваць прадстаўляемыя зводкі і матэрыял, баючыся несці адказнасць за гэту работу. Не дзіва, таварышы, што ў СНК і ЦК і радзе іншых цэнтральных устаноў прыходзіцца лішні раз, калі хочаце, засядаць. Гэта не значыць, што мы не вінаваты ў шматлікасці пасяджэнняў. Але прыходзіцца лішні раз засядаць, бо часта даюцца матэрыялы сырыя, не прапрацаваныя, праекты не прадуманыя, не сфармуляваныя; як напіша справавод якога небудзь наркамата і, цэнтральная установы, так яго кіраўнік наркамата ці ўстановы нясе ў СНК, толькі візу кладзе на праект. Бываюць выпадкі не чытаюць людзі гэтых праектаў, пры ходзіцца працаваць за іх. І ў вас, у раёнах, гэтага колькі хочаце. Бы выпадак, што прыходзіць старшыня РВК і агранам у НКЗем, спрачаюцца за пасеўную плошчу. І ў адзін і той-жа дзень называюць тры лічбы. Дапытваецца НКЗем у агранома за што ты адказваеш, што ты робіш? Я, кажа, не ведаю. А старшыня РВК штампуе такія лічбы агранома.

Задача заключаецца ў тым, каб кожны работнік вывучаў справу, тады ён не будзе штампаваць, тады ён будзе падпісваць матэрыял, будзе смялей адказваць бо ён будзе ведаць справу і здолее за справу адказваць.

Папятае, наша задача заключаецца ў тым, каб звесці да мінімума усякія камісіі, шмат пасяджэнняў, лішнюю гаварыльню. Таму зніжаюцца калегіі ў наркаматах рашэннем з'езда. Зніжаецца шмат намеснікцтва, а то ў нас часам разводзяць столькі намеснікаў, што хоць адбаўляй.

Пашостае, мы павінны навучыць шанаваць совецкія законы і партыйныя дырэктывы зверху да нізу, а то некаторыя, як гаварыў тав. Сталін, вяльможы думаюць, што пастановы партыі і ўрада пішуцца не для іх, а для другіх. А ў нас тут па месцы зневажаных адносін да пастаноў партыі і ўрада колькі хочаце. Задачы заключаюцца ў тым, каб навучыцца і мы навучым шанаваць совецкія законы і дырэктывы партыі, каго-б гэта ні датычыла — партыйных і беспартыйных. Трэба, каб кожны совецкі работнік —і партыйны і беспартыйны—прымаў-бы дырэктывы партыі і ўрада як свае родныя дырэктывы і пастановы і змагаўся-б за іх выкананне.

Вось гэта галоўныя арганізацыйныя задачы, якія мы павінны безадкладна выканаць. Пры іх выкананні будзе поўная гарантыя, што план 1934 г.—другога года другой пяцігодкі — будзе выканаў і мы не паўторым таго прарыву, які быў дапушчан у выкананні промфінплана 1933 г.

Трэба мець на ўвазе, што хто не пажадае перабудаваць сваю работу ў адпаведнасці з заданнямі 17-га з'езда партыі, то партыя і ўрад будуць тых людзей адхіляць ад работы, як непаправімых бюракратаў, як зрыўшчыкаў совецкай дысцыпліны. Мы будзем зніжаць іх на ніжэйшыя пасады, а на іх месца высоўваць новых, маладых работнікаў, здольных сваёй дзелавой работай забяспечыць дырэктывы партыі і совецкага ўрада.

Асабліва вялікія задачы стаяць перад горсоветамі, РВК і сельсоветамі. Горсоветы павінны ў дзесяткі раз канкрэтызаваць сваю работу, паляпшаць свае кіраўніцтва комунальнай гаспадаркай. Нельга так, таварышы, далей працаваць. Многія з вас ведаюць, што ў нас атрымлівалася нейкая камедыя. Пры адсутнасці санпага пуці за гор. Менскам, у Менску ад снежных заносаў трамваі спыняліся. Нядаўна хадзіў анекдот: «Як называецца той горад, у якім спыніліся трамваі з-за снегу пры адсутнасці санпага пуці?» і адказвалі «гэта — Менск». Гэта не анекдот. Гэта быль. Выпаў на вяршок снежок і вось па Менску 60-гадовыя старухі хадзілі і вспікамі капвралі рэйкі, не маглі іх ачысціць і каля сутак стаяў трамвай. Прышлося СНК умяшацца і напрасіць каб да 6 гадзін ніводнай каўрыгі снегу не асталося. За суткі яны не маглі ачысціць, а за тры гадзіны ночы ачысцілі. Значыцца, трэба было націснуць. А колькі ў нас такіх гарадоў, дзе ходзяць па вушы ў грязі? Колькі хочаце. Змагаюцца за капіталаўкладанні, за мільёны, а каб вывезці граз, патраціць якую-небудзь тысчонку, каб грязь вывезці — да гэтага людзі не дадумваюцца і гэта грязь псуе жылы фонд, заражае людзей сынным тыфусам і т. д. Вось паглядзіце, рабочы клас адзяваў ад буржуазіі міль ярдное состояніе — цэлыя гарады: Менск, Віцебск, Орша і т. д. Гэта-ж неапанімы здабытак, але захаваць гэты здабытак ад грязі ад разбурэння не ўмеем. Паварварску адносяцца да мільённага дабра і думаюць, што ўвесь сэнс заключаецца ў тым, што будуць сыпаць мільёны і што хтосці будзе за іх вазіць грязь. Трэба капалізацыю ў чыстаце падтрымліваць, краны ў кватэры трымаць у спраўнасці, а ў нас так бывае, або не ідзе вада двое сутак, або двое сутак заліває кватэру вадой і ад гэтага разбураецца кватэра, дом і ніхто крана не адрамантуе. Ёсць некаторыя вяльможы і сярод рабочых: замест таго, каб атрымаўшы кватэру ў добрым комунальным доме, сачыць за ёй, а калі якія-небудзь дробязі папсуюцца тут-жа наладзіць часам самаму, або напрасіўшы жакт, ён чакае пакуль усё разбурыцца, думаючы «я—рабочы клас, я пролетарый, я плачу за кватэру, а калі і кватэра разваліцца, пайду ў горсовет, стукну кулаком па стаду і скажу—дайце мне другую кватэру». Ёсць такія вяльможы і сярод рабочых, на жаль, і сярод іх ёсць неахайнікаў, неахайнікаў самых сапраўдных, а рабочыя павінны быць прыкладам чыстаты і ахайнасці. І гэтая неахайнасць, гэтая безгаспадарчасць прыводзіць да разбурэння мільярдны здабытак.

Таму атрымліваецца, што мы не паспяваем будаваць жыллоплошчу таму, што яна развальваецца ў некаторых гарадах (вядома не ва ўсіх) хутчэй, чым мы будуем. Не даглядаем мы за жыллёвым фондам.

Калі мы гаворым аб перабудове работы горсоветаў, то трэба ў першую чаргу пачаць з барацьбы за чоткую работу ў галіне кіраўніцтва комунальнай гаспадаркай. Гэта адносіцца да горсоветаў і да райвыканкомаў.

Скажыце, пяўжо ў нас няма такога райвыканкома, які з'яўляецца гаспадаром развіцця сельскай гаспадаркі ў раёне. Як вы думаеце, ці ёсць такія, ці не? Па-моему і не мала ёсць. А што такое сельская гаспадарка для райвыканкома? Гэта асноўная работа ў раёне, для РВК такой другой задачы няма. Ці ўсе РВК аўладаюць як належыць сельскай гаспадаркай, кіруюць яе развіццём у сваім раёне? Не, не ўсе. Калі-б яны кіравалі ўсе як след, то яны-б своечасова прадстаўлялі нам свайго раёна, а то многія не далі гэтага плана, значыць не ўмеюць скласці, не разбіраюцца ў гэтым.

Нельга далей цярпець такога становішча ў рабоце многіх горсоветаў і некаторых РВК у галіне кіраўніцтва сельскай і комунальнай гаспадаркай.

Таварышы, партыя прыняла на 17 з'ездзе праграму другой пяцігодкі; праграма вялікая, але зусім рэальная. Частку гэтай праграмы мы павінны выканаць у 1934 годзе, якая прадстаўлена СНК БССР як план 1934 г. на зацвярджэнне сесіі ЦВК.

Для таго каб выканаць гэтую вялікую праграму мы ў першую чаргу павінны самі падцягнуцца, падцягнуць сваю шарэнгу. Выканаць праграму другой пяцігодкі — гэта аначыць падцягнуцца. Мы, прыняўшы праграму другой пяцігодкі, ідзем далей у соцыялістычнае наступленне разгорнутым фронтам. Так трэба

ФАШЫЗМ РЫХТУЕ РАСПРАВУ НАД ПРАВАДЫРАМІ КПГ

## ПРАЦЭС т. т. ТЭЛЬМАНА І ТОРГЛЕРА

ЛОНДАН, 2 (БЕЛТА).

Як паведамляе «Дэйлі тэлеграф», германскі урад астанавіў наладзіць у хуткім часе працэс усіх кіруючых комуністычных дзеячоў Германіі. Галоўнымі абвінавачанымі будуць Тэльман і Торглер.

## СУД НАД ГАРРЫ ПОЛЛІТАМ І ТОМАМ МАННАМ

ЛОНДАН, 1. (БЕЛТА).

Том Манн і Поллітам зноў прадстаялі перад паліцэйскім судом у Понтыпрыддзе (Уэльс) па абвінавачанню ў выказванні «мяцежных прамоў». Пасля паказанняў сведак абодва абвінавачаныя зноў вызвалены пад заклад да 14-га сакавіка, калі адновіцца слуханне іх справы.

## БАЛГАРСКАЯ КОМПАРТЫЯ ГАНАРЫЦЦА СВАІМ ПРАВАДЫРОМ

### *ДАРАГІ тав. ДЗІМІТРАЎ!*

«Абнімаем цябе з прычыны твайго вызвалення. Наша партыя ідзе па тваім шляху — шляху бесстрашнай і непрымірымай барацьбы супроць фашызма, за совецкую Балгарыю.

Наша партыя яшчэ больш умоцніць барацьбу ў абарону Совецкага Саюза, які даў табе свабоду. Яна паднесе наперад сцяг Комуністычнага Інтэрнацыянала, пад якім ты змагаўся, які ты высока падняў у Лейпцыгу ў сваіх моцных руках.

Ты, тав. Дзімітраў, паказаў моцную згуртаванасць балгарскай компартыі з Комуністычным Інтэрнацыяналам, узначальваемым тав. Сталіным — правадыром суветнага пролетарыята. Згуртаваная як ніколі вакол Выканкома Комінтэрна, вакол свайго Цэнтральнага Камітэта балгарская компартыя ідзе наперад да новых баёў.

Няхай жыве наша пролетарская бацькаўшчына — СССР! Няхай жывуць Комінтэрн! Няхай жывуць Дзімітраў, Цаноў і Танеў!

ПРАДСТАЎНІЦТВА ЦК КП БАЛГАРЫІ ПРЫ ВККІ.

## ПІСЬМО ТАНЕВА І ПАПОВА

МАСКВА, 2. (БЕЛТА). Тт. ТАНЕЎ і ПАПОЎ перадалі ў рэдакцыю «Последних известий» наступнае письмо:

«Таварышы, мы рады перадаць па радыё прывітанне ўсім рабочым Совецкага Саюза, прывітанне чырвонаармейцам і чырвоным камандзірам, прывітанне рабочым і прапоўным усяго свету, якія муж на змагаліся за наша вызваленне.

Мы шчаслівы, што з'яўляемся совецкімі грамадзянамі, першай социялістычнай рэспублікі свету.

ПАПОЎ, ТАНЕЎ.

### МАЦІ І СЯСТРА ДЗІМІТРАВА І ЖОНКА ТАНЕВА ВЫЕХАЛІ У МАСКВУ

БЕРЛІН, 1 (БЕЛТА).

Сёння ўвечары выехалі з Берліна ў Маскву матка і сястра Дзімітрава і жонка Танева.

### ФРАНЦУЗСКІЯ ВОДГУКІ НА ВЫЗВАЛЕННЕ ДЗІМІТРАВА, ПАПОВА І ТАНЕВА

ПАРЫЖ, 1 (БЕЛТА).

Увесь друк яшчэ адгукаецца на прыбыццё Дзімітрава, Папова і Танева ў Маскву. Газеты адзначаюць энтузіязм, з якім насельніцтва СССР сустрэла героеў, вырваных з фашысцкіх засценкаў. Лонданскі карэспандэнт «Таймс» паведамляе таксама аб глыбокім уражанні, зробленым на грамадскую думку Англіі вызваленнем Дзімітрава, Папова і Танева і урачыстай сустрэчай іх у СССР.

## ІНТЭРВ'Ю ГЕРЫНГА

БЕРЛІН, 1 (БЕЛТА).

28-га лютага міністр прапаганды Гебэльс прыняў прадстаўнікоў замежнага друку.

Прыбыўшы на прыём ГЕРЫНГ сыніўся на акалічнасцях вызвалення Дзімітрава, Папова і Танева. Наперакор свайму нядаўняму інтэрв'ю, у якім катэгарычна выказаўся супроць вызвалення Дзімітрава і яго таварышоў, зварачаючыся да самых недвузначных пагроз, ён цяпер заявіў, што ў пытанні аб вызваленні балгар «панавала поўная адназгодненасць». Вызваленне іх нібыта было «загадзя вырашанай справай». Сваю гутарку ён «свядома» даў у такой форме». Адтэрмінаванне вызвалення балгар Герынг прабаваў тлумачыць тым, што ён «не хацеў дзейнічаць пад націскам замежнага друку і хацеў сам вызначыць час іх вызвалення».

## ПРЫЁМ ГРУПЫ АМЕРЫКАНСКІХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ В. В. КУЙБЫШЭВЫМ

МАСКВА, 2. (БЕЛТА).

28-га лютага старшыня ўрадавай камісіі па арганізацыі дапамогі ўдзельнікам экспедыцыі праф. О. Ю. Шмідта і каманды «Челюскина» тав. В. В. КУЙБЫШЭЎ прыняў групу амерыканскіх карэспандэнтаў: карэспандэнта «Н'ю-Ёрк таймс» п. Дэвранці, прадстаўнікоў «Асашыэтэд прэс» п. Рычардсона, «Юнайтэд прэс» п. Берда, «Інтэрнашыонэл н'юс сервіз» п. Паррот і карэспандэнта газеты «Чыкаго дэйлі н'юс» п. Стоммэн.

На прыёме прысутнічаў нам. начальніка галоўнага кіраўніцтва Паўночнага морскага шляху т. ІОФФЕ.

Расказаўшы падрабязна ўвесь ход экспедыцыі праф. Шмідта і гібелі «Челюскина», т. Куйбышэў перахадзіць да пытання аб мерах дапамогі, прынятых урадам.

— Вельмі вялікую дапамогу, — гаворыць т. Куйбышэў, — могуць прынесці САМАЛЁТЫ. Але для іх работы патрэбны адпаведная пагода і падыходзячыя пасадачныя пляцоўкі. Якраз гэтых даных на ўзбярэжжы да гэтага часу не было. Лютавалі ў апошні час зацеі, цурга, была дрэнная відзімасць. Пляцоўкі запосіліся снежнымі запосамі, якія быстра ледзянелі і рабілі амаль немагчымым пад'ём самалётаў.

Нашы палярныя самалёты, за выключэннем аднаго, — гэта цяжкія машыны з вялікай пасадачнай хуткасцю, якія патрабуюць вялікіх аэрадромаў і прызначаюцца для суправаджэння судоў у летні час (на палаўках). Тым часам цяпер падыходзяць больш лёгкія самалёты з мінімальнай пасадачнай хуткасцю, якія патрабуюць для пад'ёму і пасадкі невялікіх плацовак. Мы прынялі меры да адпраўкі параходамі дадатковых самалётаў.

З Петрапаўлаўска-на-Камчатцы 28 лютага вышаў пароход «Сталінград» з двума самалётамі. Ва Владзівастоку заканчвае нагрузку 7 самалётаў пароход «Смаленск». У хуткім часе мы адправім яшчэ трэці пароход з некалькімі самалётамі. Апрача таго, з Хабараўска ўздоўж узбярэжжа Ахоцкага і Берынгава мораў, перасякаючы Камчатку, паляціць на машыне, спецыяльна прыстасаванай для далёкіх зімніх палётаў, лётнік Вадан'янаў.

Самалёты, якія ідуць на параходах «Сталінград» і «Смаленск», з прычыны далёкай адлегласці і труднасці плавання сярод штормаў і ільдоў, як відаць, будуць дастаўлены не раней канца другой дэкады сакавіка.

У бліжэйшы час чакаецца паляпшэнне пагоды, бо, згодна паступіўшых даных, у раёне Чукоткі і ў Палярным моры к поўначы ад поўвострава ставаецца ўстойлівы атрог высокага ціску сібірскага антыцыклона.

Урад пастанавіў накіраваць на дапамогу экспедыцыі т. Шмідта лепшых палярных лётнікаў Саюза. На ўзбярэжжы ўжо працуюць т.т. Куканаў і Лепідэеўскі.

З параходам «Смаленск» адпраўляюцца пілоты т.т. Молакаў, Светагораў і Каманін; на трэцім параходзе паедуць лётнікі т.т. Даронін, Ліп і Галышаў, а з Хабараўска, як сказана, вылятае т. Вадан'янаў. Апрача таго, спешна адпраўлены праз Амерыку (Н'ю-Ёрк — Аляска — мыс Уэлен) вядомыя палярныя лётнікі т.т. Леванеўскі і Слепнёў і вядомы палярнік-даследчык вострава Врангеля і Паўночнай зямлі тав. Ушакоў.

Тав. Куйбышэў напамінае, што лётнікі тт. Слепнёў і Галышаў прымалі ўдзел у росшуках амерыканскага пілота Эйльсона, а лётнік Леванеўскі аказаў дапамогу пацярпеўшаму аварыю лётніку Матэрну.

Расказаўшы аб мабілізацыі сабака га транспарта, т. Куйбышэў падкрэслівае, што для поспеху работы сабак на такой вялікай адлегласці, ва ўмовах дрэйфуючых ільдоў карысна, каб сабачым упражкам упоравалі дарогу лёгкія самалёты, інакш сабачыя ўпражкі могуць збіцца з дарогі.

— Такім чынам,—заключае тав. Куйбышэў, — выратаванне экспедыцыі т. Шмідта з'яўляецца задачай вельмі трудная. Мы ўпэўнены, што гэту задачу вырашым таксама, як перамагалі і іншыя труднасці ў барацьбе з стыхіяй у Арктыцы. За ходам работ па выратаванню экспедыцыі т. Шмідта сочыць уся наша краіна. Я ўпэўнен, што погляды народаў і іншых краін з увагай і трывогай накіраваны да таго пункта Палярнага мора, дзе адважна змагаюцца з суровай прыродай Арктыкі нашы палярныя героі.

Пасля паведамлення т. Куйбышэва амерыканскія карэспандэнты задалі яму рад пытанняў. На пытанне карэспандэнтаў, ці звярнуўся совецкі ўрад да ўрада ЗША аб аказанні дапамогі экспедыцыі, т. Куйбышэў адказаў: «Не».

На пытанне, наколькі небяспечным трэба лічыць становішча чэлюскінцаў, т. Куйбышэў адказаў, што становішча чэлюскінцаў пельга лічыць безапасным, бо небяспека падсцерагае іх на кожным кроку. Пытанне заключаецца не толькі ў аказанні дапамогі, але ў аказанні хуткай дапамогі, бо сярод чэлюскінцаў ёсць жанчыны і дзеці, а таксама, прыкладна з дзесятак, асоб слабасільных, якія з труднасцю пераносяць цяжкія арктычныя ўмовы. Чэлюскінцы забяспечаны двухмесячным запасам харчавання і поўным камплектам медыкаментаў. Тав. Куйбышэў агаласіў апошнія метэаралагічныя зводкі, згодна якім перспектывы для палётаў на бліжэйшыя дні паспрыяючы. Тав. Куйбышэў далаў, што тт. Леванеўскі, Слепнёў і Ушакоў былі адпраўлены ў Н'ю-Ёрк ужо праз некалькі дзён пасля атрымання вестак аб аварыі «Чэлюскина». 21-га лютага лётнікі пакінулі Сауптгемптон і прыбылі ўжо ў Нью-Ёрк. Яны будуць у Вашынгтоне чакаць інструкцый урадавай камісіі.

Пасля двухгадзіннай гутаркі амерыканскія карэспандэнты падзякавалі т. Куйбышэва за падрабязнае паведамленне аб становішчы чэлюскінцаў і аб мерах, прынятых к іх выратаванню.

## КЛАСАВЫЯ БАІ ЗА РУБЯЖОМ

### УСЕАГУЛЬНАЯ ЗАБАСТОЎКА РАБОЧЫХ ГАРБАРНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 2 (БЕЛТА). У адказ на скарачэнне зарплаты варшаўскія гарбары абвясцілі ўсеагульную забастоўку. 27-га лютага да забастоўкі далучыліся рабочыя-гарбары ўсёй Польшчы.

### 15000 БЕЛЬГІЙСКІХ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ БАСТУЮЦЬ

ПАРЫЖ, 2 (БЕЛТА).

З Бруселя паведамляюць, што забастоўка 15 тыс. тэкстыльшчыкаў у Верв'е прадаўжаецца. Забастоўшчыкі рашуча змагаюцца з асобнымі штрэйкбрэхерамі. Компартыя распаўсюджвае сярод рабочых спецыяльны забастовачны бюлетэнь.

### ЗАБАСТОЎКА ШОФЕРАЎ ПАРЫЖА ПРАДАЎЖАЕЦЦА

ПАРЫЖ, 2 (БЕЛТА).

Як паведамляе «Юманіта», забастоўка 25 тысяч шофераў таксі прадаўжаецца ўжо месяц з вялікай упартасцю. Пушчаныя на гораду 150 таксі цыркулююць пад аховай паліцыі. Буржуазны друк патрабуе ўзмацнення рэпрэсій супроць бастуючых. Паліцыя арыштавала пасля мітынга 13 членаў цэнтральнага стачкома, але па трэбаванню шофераў вымушана была іх вызваліць.

## СОВЕЦКІЯ ЛЕТНІКІ ПРЫБЫЛІ У НЬЮ-ЁРК

НЬЮ-ЁРК, 1 сакавіка (БЕЛТА).

Совецкія палярныя лётнікі Леванеўскі і Слепнёў, а таксама палярнік Ушакоў прыбылі ў Нью-Ёрк.

## ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ВЦСПС

У сувязі з тым, што рабочымі Совецкага Саюза ўжо сабрана і пераслана на бягучы рахунак ВЦСПС у фонд дапамогі аўстрыйскім рабочым—ахвярам фашызма каля мільёна шылінгаў (у пераводзе на аўстрыйскую валюту), прэзідыум ВЦСПС пастанаўляе перадаць секцыі МОПР'а СССР для аказання дапамогі рабочым Аўстрыі —ахвярам фашызма — 1 млн. аўстрыйскіх шылінгаў.

БЕЛТА.

## ПАВЕДАМЛЕННЕ ДЗЯРЖБАНКА

У сувязі з разгарнуўшымся зборам сродкаў для аказання дапамогі рабочым Аўстрыі—ахвярам фашысцкага тэрора, а таксама зборам сродкаў у фонд імя загінуўшых герояў стратасферы тт. Федасеенка, Васенка і Усыскіна ва ўсебеларускай канторы Дзяржбанка адкрыты бягучыя рахункі:

1. Фонд дапамогі рабочым Аўстрыі № 160/9386.
2. Фонд імя тт. Федасеенка, Васенка і Усыскіна на асваенне стратасферы № 160/150049.

## АДКРЫЎСЯ З'ЕЗД НАСТАЎНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

Учора ў памяшканні Беларускага дзяржаўнага тэатра адкрыўся 1-ы ўсебеларускі з'езд настаўнікаў-ударнікаў.

На з'езд прыбылі 451 дэлегат з усіх раёнаў БССР.

У прэзідыум з'езда выбрана 50 асоб, сярод якіх тт. Галадзед, Чарнушэвіч, Чарвякоў, Калацілаў (старшыня ЦК рабпрацасветы), Конік, Рыскін, Закоўскі, Бенек, Убарэвіч, Горын, Ратнек, Брагін скі, Герцовіч і інш.

Пад гром апладысментаў у ганаровы прэзідыум выбраны Палітбюро ЦК ВКП(б) і тт. Крупская, Бубноў, Гікало, Косарэў, Тэльман, Ленскі і Дзімітраў. Шумнай авацыяй пад крыкі ўра прымаецца прапанова выбраць ганаровым старшынёй з'езда т. Сталіна. Усе ўстаюць. Аркестр выконвае «Інтэрнацыянал».

З дакладам аб выніках 17 партз'езда і задачах настаўнікаў выступіў спатканы дружнымі апладысментамі старшыня СНК БССР тав. Галадзед.

З'ездам атрыманы прывітальныя тэлеграмы ад тт.: Крупскай, Бубнова і Затонскага (НКА УССР). З'езд таксама віталі дэлегацыі менскіх настаўнікаў і піонераў.

З'езд паслаў прывітальныя тэлеграмы тт. СТАЛІНУ, КРУПСКАЙ, ДЗІМІТРАВУ і ГІКАЛО.

## СОВЕЦКІЯ ТОРФАКАМБАЙНЫ

Менскі завод імя ВАРАШЫЛАВА асвойвае выпуск тарфянога камбайна сістэмы Багера. Да красавіка мяркуецца выпусціць першыя 5 багераў, прызначаных для торфазавода «Большэвік»—апалавай базы касцюковіцкага шклозавода.

Багер—тарфяны камбайн, які знач на механізуе торфаздабычу. Тарфяны камбайн дае за сезон пры штапе ў 8—9 чалавек 24 тысячы тон аналу.

На зборцы першага торфакамбайна працуюць лепшыя брыгады завода.

## ЛІТАРАТУРА

5-га сакавіка ў Маскве адбудзецца пленум оргкамітэта саюза совецкіх пісьменнікаў СССР. Для ўдзелу ў рабоце пленума ад пісьменнікаў БССР выязджае дэлегацыя ў складзе: Клімковіча, Якуба Коласа, Янкі Купалы, Дунца, Александровіча, Галавача, Бранштэйна і інш.

На пленуме будзе заслухан даклад старшыні оргамітэта ССПБ тав. Клімковіча аб рабоце пісьменнікаў БССР і падрыхтоўцы да ўсе беларускага і ўсесаюзнага з'езду пісьменнікаў.

Оргкамітэт ССПБ арганізуе рад творчых камандыровак для пісьменнікаў. Першая група ў складзе т. т. Александровіча, Галавача і Гурскага ўжо выехала ў Маскву. У двухмесячныя творчыя камандыроўкі ў Маскву, Ленінград і Харкаў у бліжэйшы час таксама выязджаюць пісьменнікі Бядуля, Зарэцкі, Харык і Броўка.

## ПАЗЫКА АНТЫРЭЛІГІЙНАЙ ПРАПАГАНДЫ

Цэнтральны Совет валяўнічых бязбожнікаў БССР і ЦБ навуковых работнікаў выпусцілі пазыку антырэлігійнай работы. Кожны ўдзельнік пазыкі—навуковы работнік бярэ на сябе абавязацельства адпрацаваць на працягу года 10 гадзін па антырэлігійнай рабоце (даклады, лекцыі, гутаркі і т. д.).

У БССР павінна быць рэалізавана 5 тыс. аблігацый на 5 тыс. гадзін антырэлігійнай работы.

## ЗЛЁТ ВЫНАХОДНІКАЎ

На магілёўскай гарбарні імя Сталіна адбыўся злёт вынаходцаў, у якім прымала ўдзел 120 лепшых ударнікаў. За студзень паступіла 47 прапаноў, якія даюць эканомію ў 5400 руб., у лютым 56 прапаноў, з эфектыўнасцю ў 10.500 руб

## МАСТАЦТВА

5-га сакавіка яўрэйскі дзяржаўны тэатр БССР пачынае свае гастролі ў Гомелі. Будуць даны пастаноўкі «Рэкрут», «Вальпане», «Ботвін», «Гірш Лекерт», «На млыну».

Нарком асветы прадаставіў БДТ-2 трохмесячны тэрмін для вучобы. Гэты час тэатр будзе працаваць над новымі п'есамі.

У сакавіку будуць даны першыя паказальныя канцэрты недаўна арганізаванага ў Менску дзяржаўнага струннага квартэта БССР. У склад квартэта ўваходзяць т. т. Бяс смертны (першая скрыпка), Жыў (другая скрыпка), Гуральнік (альт), Арлоў (віяланчэль).

## „ПИКОВАЯ ДАМА" У ПАСТАНОЎЦЫ Б. МАРДВІНАВА

Учора ў Менск прыехаў рэжысер МХАТ імя А. М. Горкага, галоўны рэжысер маскоўскага музычнага тэатра імя Немірові - Данчанка Б. А. МАРДВІНАЎ. Тав. Мардвінаў прыехаў на запрашэнню Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета для пастаноўкі «Пиковой дамы».

У гутарцы з нашым супрацоўнікам тав. Мардвінаў паведаміў аб перспектыўных планах пастаноўкі гэтага спектакля.

— Галоўны ўпор у маёй рабоце, — адзначыў тав. Мардвінаў, — на выхаванне актора. Я буду імкнуцца паказаць на сцэне актора, стваральнага жывы вобраз. Мяне асабліва вабіць работа ў маладым беларускім оперным тэатры.

«Пиковую даму» мы будзем імкнуцца паказаць не ў плане асабістай драмы Германа, а ў плане класавай дыферэнцыяцыі грамадзтва тых часоў. Герман будзе дан, як малады чалавек пачатку XIX века ў плане некаторай пераклічкі з вобразам Печорына, з самім Лермантавым.

Над «Пиковой дамой» тав. Мардвінаў мяркуе працаваць каля 2-х месяцаў (май-чэрвень). Спектакль будзе паказан менскаму гледачу 25-га ліпеня.

Разам з Б. А. Мардвінавым для афармлення «Пиковой дамы» ў Менск прыязджае мастак Вільямс.

Учора ўвечары адбылася першая лекцыя-гутарка тав. Мардвінава з артыстамі тэатра на тэму «Школа Станіслаўскага ў оперным спектаклі».

## Паведамленне

3-га сакавіка а 6 гадзіне ўвечары ў Доме Комасветы (малая зала) склікаецца нарада ўсіх сакратароў парткомаў і парторгаў па пытанню аб перабудове партапарата ў сувязі з рашэннямі XVII з'езда ВКП(б).

Усе таварышы павінны захваціць з сабой матэрыялы аб выкананні промфінплана за студзень і люты і аб перабудове партработы.

Гарком КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

## ЯПОНСКАЯ МАРЫЯНЕТКА НА ТРОНЕ

### КАРАНАЦЫЯ ПУ-І

### „МАНЧЖУРСКАЯ ІМПЕРЫЯ" У ЯПОНСКІМ ВЫДАННІ

ТОКІО, 1 (БЕЛТА).

Як паведамляе агенцтва «Сімбун Рэнга» першага сакавіка адбылася каранацыя Пу-І.

Пу-І ў далейшым будзе называцца «імператар Канто», а Манчжоу-Го названа «Манчжоу-Дыго (імперыя Манчжоу-Го).

Апублікаван «арганічны закон» Манчжоу-Го, які вызначае «правы манчжурскага імператара», які стаіць вышэй закона і з'яўляецца галоўнакамандуючым сухасэмных, морскіх і паветраных сіл і мае права абвяшчаць вайну і заключаць мір і ўлада вады. Апублікаван таксама маніфест Канто, які падкрэслівае «сардэчнае падтрымманне прыяцельскай краіны — Японіі».

Спецкор «Асашыэтэд прэс» падкрэслівае, што ў часе церэмоніі Чаншунь напамінаў АСАДЖАНЫ ГОРАД. Пу-І ездзіў з палацу к салтару неба» на браніраваным аўтамабілі. На абодвух баках дарогі сталі бесперарыўным рады ўзброеных японскіх і манчжурскіх салдат у вогуле не менш 50 тыс. Кожны чаньвёрты салдат быў ЯПОНЕЦ, на якім ляжала падвойная адказнасць — ахоўваць імператара і наглядаць за манчжурскімі салдатамі. Журналісты і фотакарэспандэнты былі акружаны ўзброенымі агентамі тайнай паліцыі. У горадзе ў часе церэмоніі, апрача ваенных амаль ні кога не было. Ва ўсёй церэмоніі не было нават і намёку на ўдзел народных мас.

«Сімбун Рэнга» публікуе віншавальныя тэлеграмы САІТО і ХІРОТА новаму імператару. У Чаньчуне апублікаван таксама рад дэкларацый манчжурскага ўрада і асобна прэм'ера і міністра замежных спраў, якія запэўнюць, што «унутраная і знешняя палітыка Манчжоу-Дыго астаецца ранейшай».

У афіцыяльных матэрыялах, апублікаваных з прычыны каранацыі, указваецца, між іншым, што ў Манчжурыі знаходзіцца каля 65 тыс. «бандытаў».

## АНГЛІЙСКІЯ БЕСПРАЦОЎНЫЯ ШТУРМУЮЦЬ ПАРЛАМЕНТ

ЛОНДАН, 1. (БЕЛТА).

26-га лютага ўдзельнікі галоднага паходу групамі ў 5-10 чалавек сталі збірацца к будынку парламента. У некалькі мінут сабраўся натоўп у тысячу чалавек. 200 з іх удалося прапікнуць у памяшканне палаты абшчын і сустрэцца з прадстаўнікамі сваіх абласцей. У чаканні дэлегатаў астатнія ўдзельнікі пелі «Інтэрнацыянал», і іншыя рэволюцыйныя песні. Кіраўніцтва галоднага паходу апублікавала пратэст супроць адносін да удзельнікаў галоднага паходу. Кіраўніцтва патрабуе, каб міністры працы, аховы здароўя, асветы, транспарта і пенсій прынялі дэлегацыю ўдзельнікаў паходу.

## Абавязацельствы па будаўніцтву самалёта-гіганта „Максім Горкі" выкананы

**Працоўныя масы Беларускай ССР, сабраўшы сродкі на пабудову паветранай эскадрыльі імя тав. Кагановіча, выканалі таксама і свае абавязкі па будаўніцтву агітацыйнага самалёта-гіганта імя вялікага пролетарскага пісьменніка МАКСІМА ГОРКАГА.**

**Звыш двухсот тысяч рублёў на самалёт-гігант «Максім Горкі» Беларускім камітэтам садзейнасці пераведзены на бягучы рахунак усесаюзнага камітэта па пабудове агітсамалёта, 50 тысяч рублёў —на пабудову асобнага самалёта ў складзе эскадрыльі імя Максіма Горкага.**


Панешчанне Дз. польскага тэатра (Совецкая, 29, тэл. 21-612) 4 і 5 сакавіка ПРЭМ'ЕРА ЛЕДЗЯНЫ ДОМ

музычнае представлення ў 3-х дз. і 6 малюн. (па раману ЛАЖЭЧНИКОВА) Музыка ЛИСТОВА. Пастаноўка Вал. Бебутава.

(Дзеянне адбываецца ў Санкт Петербурзе ў 1740 г.).

Білеты ў рабочай касе з 12 да 2-х і з 4-х да 6 і ў касе тэатра.

Кіно „Інтэрнацыянал" Ад 1 сакавіка замежны мастацкі фільм ПАЛКАЕ ЮНАЦТВА

драма ў 7 частках.

У праграме кіно-хроніка „САЮЗКІНО"

Выдавецтва ЦК КП(б)Б „ПАРТВЫДАТ"

выйшаў друку і паступіў у прадаж БЛОК-НОТ АГІТАТАРА № 2 (41).

прысвечаны міжнароднаму жаночаму дню.

ЦАНА 25 КАП.

Кіно „СПАРТАК". Ад 2 сакавіка замежны мастацкі фільм МІЛЬЁН за ВЯЧЭРУ

ў 8 частках.

У праграме кіно-хроніка, выпуск 2-ці Беларускіка, прысвечаная 16-годдзю Чырвонай арміі.

ШТОДЗЕННА 5 сеансаў. Касы з 4 г. дня

Кіно-тэатр „Чырвоная Зорка" 2-я серыя прыгодніцкага фільма ВОСТРАЎ ТАЙН

У фае—канцэртнае адзяленне.

Кіно ПРОЛЕТАРЫЯ Замежны мастацкая камедыя МІС ФРУЦІ

Дзіцячы Гумавы кіно-тэатр ДВА БРАНЯВІКА Гістарычны фільм з эпохі грамадзянскай вайны

Бабруйскае аддзяленне Дзяржбанка абвяшчае ПРАДАЖУ

усіх матэрыяльных каштоўнасцей Бабруйскай базы БКС

у сувязі з пратэрміноўкай пазык а іменна: мануфактура, хустки, абутак, галантарэя кандзіцерскія вырабы і інш. прам. і харчтавары.

За даведкамі звяртацца ў Бабруйскае аддзяленне Дзяржбанка.

Бабруйскае аддзяленне Дзяржбанка.

4-га сакавіка ў 7 гадзін вечара (у памяшканні горсовета, пакой 32) адбудзецца

НАРАДА БЮРО СЕКЦЫЙ і ДЭПУТАЦКІХ ГРУП.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Становішча работы па ўкараненню культ-бытавога мінімума.
2. Аб удзеле секцый і дэпутацкіх груп у самакультпаходзе.
3. Розное.

На нараду павінны з'явіцца ўсе члены секцый і дэпутацкіх груп, прадстаўнікі Камгаса, радчэддзела, Эльвода, трэста зялёнага насаджэння.

Запрашаюцца прадстаўнікі газеты „РАБОЧИЙ", гарпрофсовета, совецкі і профаргані зацый прадпрыемстваў.

Орг. сакрэтар Аддзел Менгорсовета.

Пры Менскім педагагічным Інстытуце арганізован ІНСТЫТУТ выходнага дня

для выкладчыкаў пачатковай і сярэдняй школы, рабфаку і тэхнікумаў усіх спецыяльнасцей (гісторыя, літаратура, мова, геаграфія, матэматыка, прыродазнаўства, фізіка, замежныя мовы).

ІНСТЫТУТ ВЫХОДНАГА ДНЯ

будзе працаваць 3 разы ў месяц, кожны 6, 18, 30. У вызначаныя дні інстытут будзе працаваць з 5 да 10 гадзін вечара. У якасці заключнай часткі ў кожны дзень заняткаў будзе праводзіцца і мастацкая частка (канцэрт, дэкламацыі і інш).

Першы дзень заняткаў—6 сакавіка ў галоўным корпусе (університэцкаю тэрыторыя, II паверх).

Пачатак збораў—5 гадзін вечара, аўдыторыя 302, 3-ці паверх.

ДЫРЭКЦЫЯ ВПІ.

Курсы ВОСУ

арганізуюць 5-месячную групу інспектароў для раённай сістэмы кіраўніцтва народна-гаспадарчага ўчоту.

Стыпендыя ад 100 да 175 руб, інвэтэрныя 25 руб. у м-ц.

Інтэрнатам курсанты не забяспечваюцца. Да залу дадаць дакументы: аб сацыяхаджанні аб адукацыі (7 груп), аб прапоўным стажы не менш 3-х год), аб узросце (ня менш 20 год), аб адносінах да вайсковай службы, аб вызваленні з апошняга месца працы і на 40 кап. марак.

Заявы падаць у канцылярыю ВОСУ (Менск, Рэвалюцыйная 3, на двары) да 20 сакавіка ад 12 да 2 гадз. дня

Аб прыёме будзе паведомлена поштай.


## БАЛАНС

Гаспадарчых сродкаў кіраўніцтва аптэчнымі прадпрыемствамі Беларусі „БЕЛАПТЭКАКІРАЎНІЦТВА" на 1-е студзеня 1933 года і параўнанне яго з данымі бухгалтарскага баланса за 1931 год.

| АКТЫЎ | СУМА На 1-1-32 г. | СУМА На 1-1-33 г. |
|---|---|---|
| 1. Асноўныя сродкі дзейнічаючыя | 960.082—29 | 1.185.003—51 |
| 2. „ „ недзейнічаючыя | 96.701—18 | 214.938—93 |
| 3. Вытворыя запасы) | 344.436—76 | 450.664—47 |
| 4. Вытворчасць прадукцыі (затраты) | 11.155—96 | 1.107—36 |
| 5. Тавары і гатовая прадукцыя | 2.907.616—22 | 4.067.077—22 |
| 6. „ адгружаныя | 288.815—04 | 355.421—68 |
| 7. Грашовыя сродкі | 495 617—70 | 793.035—02 |
| 8. Сродкі ў разліках | 606.077—12 | 503.650—64 |
| 9. Расходы будучых перыядаў | 25.330—81 | 47.700—72 |
| 10. НКФ па адлічэннях ад прыбыткаў | 226.245—95 | 214.685—44 |
| 11. Уклады ў Белкакупбанк з ліку ФУБР'а | 7.198—96 | 107.700 — |
| 12. Каштоўныя паперы, паі і акцыі | 43.662—07 | 3.845—56 |
| БАЛАНС | 6.012.940—06 | 7.944.830—55 |

| ПАСІЎ | СУМА На 1-1-32 г. | СУМА На 1-1-33 г. |
|---|---|---|
| 1. Статутны фонд | 3.095.735—09 | 4.115.209—34 |
| 2. Амартызацыйны фонд | 190.285—93 | 259.576—33 |
| 3. ФУБР | 8.022—90 | 123.625 —96 |
| 4. Рэзервы | 55.055—71 | 80.653—73 |
| 5. Доўгатэрміновае крэдытаванне | 72.925—01 | 45.212—33 |
| 6. Кароткатэрміновае крэдытаванне | 131.433 — | 144.900 — |
| 7. Разлікі | 838.814—20 | 832.894—98 |
| 8. Накапленні | 1.620.668—22 | 2.342.757—90 |
| БАЛАНС | 6.012.940—06 | 7.944.830—55 |

### Вынікі гаспадарчай дзейнасці (накапленні і страты) за 1932 год

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1. Страты ад ліквідацыі выбыўшай маемасці | 10.910—65 | 1. Накапленні ад рэалізацыі (сальдо) | 2.301.125—45 |
| 2. Страты па операцыях з тарай | 4.321—88 | 2. „ „ аперац. з тарай | 21.640—52 |
| 3. Адлічэнні ў рэзерв на няпэўныя даўгах | 40.583—08 | 3. „ „ эксплаатацыі дапаможных прадпрыемстваў | 16.537—04 |
| 4. Ад спісання дэбіторскай запазычанасці | 2.524—16 | 4. „ „ спісання крэдыторскай запазычанасці за сцячэннем тэрміна даўнасці | 22.441—10 |
| 5. Астатнія выдаткі і страты | 110.780—90 | 5. Ад спісання невыкарыстаных рэзерваў | 33.249—28 |
| УСЯГО | 169.120—67 | Астатнія накапленні | 116.885—18 |
| Чысты прыбытак | 2.342.757—90 | УСЯГО | 2.511.878—57 |
| УСЯГО | 2.511.878—57 | | |

| АСНОЎНЫЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ ВЫКАНАННЯ ПЛАНА | На плану 1932 г. | Фактычна За 1931 г. | Фактычна За 1932 г. |
|---|---|---|---|
| Зварот па рэалізацыі (у тысяч. руб.) | 17.384 | 13926 | 19585 |
| Колькасць аптэкапрадпрыемстваў: аптэк | 210 | 177 | 189 |
| санмагаў | 34 | 34 | 35 |
| санлаўкоў | 89 | 29 | 186 |

Начальнік Белаптэкакіраўніцтва Гельфанд. Галоўны бухгалтар Школьнікаў.

Баланс разгледжан і зацверджан Балансавай Камісіяй НКАЗ 26-XII-33 г. і дазваляецца да друку.

Кіраўнік счотна-фінсектара НКАЗ Гітнін.

Менск, друкарня «Звязды». Упаўн. Галоўлітбела № К—2461.